АЎТАРСКІ ПОГЛЯД НА ЛЁС ЧАЛАВЕКА 7

КУЗНЯ СПАРТЫЎНАЙ БУДУЧЫНІ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. СУБОТА № 195 (30329)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КАЛІ МЫ ПАЛЕССЕ ПРЫВЯДЗЁМ У ПАРАДАК, МЫ ТОЛЬКІ ЗА КОШТ ПАЛЕССЯ НАКОРМІМ УСЮ КРАІНУ»

Падрабязнасці рабочай паездкі Прэзідэнта на Брэстчыну

Фота БелТА.

У цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы — ААТ «Парахонскае» Пінскага раёна. Сельскагаспадарчае прадпрыемства, якое было створана фактычна на балоце (большасць сельгасугоддзяў знаходзіцца на меліяраваных землях), сёння першае ў краіне па вытворчасці ялавічыны і трэцяе па вырабе малака. Аграпрамысловы вопыт гаспадаркі, як не раз падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, варты пераймання. Як гэта бывае заўсёды, падчас знаёмства з работай сельскагаспадарчага прадпрыемства і перспектывамі яго развіцця Прэзідэнт агучыў стратэгічныя напрамкі, важныя для ўсёй краіны. У гэтым выпадку размова ішла аб праграме адраджэння ўсяго Палесся.

«Палессе кінуць нельга»

Менавіта з пастаноўкі задач па гэтым пытанні і пачалася рабочая паездка кіраўніка дзяржавы ў Пінскі раён. «Калісьці мы падступаліся да Палесся, — нагадаў ён. — І была прынята праграма па адраджэнні Палесся. Як у нас, у чыноўнікаў, бывае: паварушыліся туды-сюды і на гэтым і скончылі. Нешта зрабілі, нешта — не. Трэба вярнуцца да гэтага пытання».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтым пытанні важна не распыляць сродкі. Ен расказаў, што ўраду дадзена даручэнне сканцэнтравацца на буйных праектах і накіроўваць туды сродкі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што за пяць гадоў краіну трэба прывесці ў поўны парадак, каб пакінуць яе ў належным выглядзе наступнаму пакаленню, дзецям. «А для гэтага трэба там, дзе неабходна, парадак навесці», — канстатаваў беларускі лідар.

СТАР. 2–3

САМАЯ ВЫСАКАРОДНАЯ ПРАФЕСІЯ

Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь

Дарагія сябры!

Сёння мы адзначаем Дзень настаўніка — сапраўды ўсенароднае свята.

Гэта свята людзей самай высакароднай, адказнай і паважанай прафесіі ў свеце, якая працягвае тысячагадовую гісторыю падзвіжніцтва і настаўніцтва.

Дзякуй усім вам, выхавацелям, настаўнікам, выкладчыкам, ветэранам педагагічнай працы, за вернасць прызванню, добрае і ўважлівае стаўленне да юнага пакалення, высокі прафесіяналізм і захаванне найлепшых традыцый айчыннай адукацыі.

Перакананы, паспяхова ўкараняючы самыя прагрэсіўныя тэхналогіі ў навучанне і выхаванне, павышаючы прэстыж і значнасць адукацыйнай сферы, вы зробіце ўсё, каб прынцып «школа — гэта храм, а педагог — святое» стаў галоўным арыенцірам для кожнага — вучняў, бацькоў, настаўнікаў.

Са святам вас, з Днём настаўніка!

Жадаю моцнага здароўя, міру і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Вучні 10 «А» класа педагагічнай накіраванасці сярэдняй школы № 207 г. Мінска імя Героя Беларусі Мітрапаліта Філарэта Марыя АЛЕЙНІКАВА, Мацвей ГАЙДУК, Паліна ЖДАНОВІЧ, Алена БАРУШКА, Арцемій СПІРЫДОНАЎ віншуюць свайго класнага кіраўніка Людмілу ГУРЫНУ з Днём настаўніка.

КАРОТКА

• Помнік беларускаму асветніку і першадрукару Францыску Скарыне ўстанавілі ў Калінінградзе на тэрыторыі гуманітарных карпусоў Балтыйскага федэральнага ўніверсітэта імя Іммануіла Канта.

• Аб'ём узаемнага гандлю харчовымі таварамі і сельскагаспадарчай сыравінай з Азербайджанам за апошнія пяць гадоў вырас на больш як 70 працэнтаў.

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

У НАШАЙ БУДУЧЫНІ НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК

У краіне дашкольнай адукацыяй ахоплена 88,9 працэнта дзяцей ва ўзросце ад аднаго да шасці гадоў

Установы дашкольнай адукацыі даўно перасталі быць тым месцам, куды працуючыя бацькі аддавалі сваіх дзяцей з адзінай важнай для сябе мэтай: каб былі ў бяспецы, накормленыя і дагледжаныя. Сёння прыярытэты змяніліся і сучасны этап развіцця дашкольнай адукацыі характарызуецца ўкараненнем інавацыйных тэхналогій у практыку работы дзіцячых садкоў, з кожным годам дадаюцца новыя нюансы.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Нязменным застаецца толькі той самы далікатны дзіцячы ўзрост, у якім закладваюцца асноўныя асаблівасці асобы дзіцяці, фарміруецца, няхай нават на ўзроўні азоў, яго грамадзянская пазіцыя. Часта садок становіцца для дзіцяці першым вопытам жыцця ў соцыуме. І менавіта таму многія педагогі ўпэўнены, што гэта ўстанова адукацыі з'яўляецца для самых маленькіх грамадзян краіны тым фундаментам, на які яны будуць абапірацца, уступаючы ў дарослае жыццё. Разам з тым, нягледзячы на выклікі часу, хочацца, каб дашкольная ўстанова адукацыі заставалася месцам, дзе дзеці былі б шчаслівыя ад зносін з дарослымі і аднагодкамі, каб захоўваліся старыя добрыя традыцыі непаўторнага дзетсадаўскага жыцця...

Сённяшняя размова пойдзе аб тым, якія мэты і задачы стаяць перад адукацыйным ведамствам Беларусі ў сферы дашкольнай адукацыі, якія ёсць праблемы на шляху іх вырашэння, аб тым, якім павінен быць сучасны выхавальнік, і іншым. Наш суразмоўца — **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.**

СТАР. 5

«КАЛІ МЫ ПАЛЕССЕ ПРЫВЯДЗЁМ У ПАРАДАК,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт нагадаў і пра іншыя такія рэгіянальныя праграмы. Напрыклад, праграму па паўднёвым усходзе Магілёўскай вобласці, адраджэнні чарнобыльскіх раёнаў, якія на працягу дзесяцігоддзяў вярталі да жыцця. «Сёння бачым, што зрабілі правільна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Даручана за зіму падумаць аб тым, што рабіць у Віцебскай вобласці, выпрацаваць адпаведныя падыходы. Кажучы аб Магілёўшчыне, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што там для эфектыўнага развіцця ўсё ёсць, акрамя дысцыпліны. «Магілёўскай вобласці патрэбна добрая пуга, — лічыць ён. — Там выдатныя землі, ёсць усё. Проста разбоўталіся».

Вяртаючыся да адраджэння Палесся, Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што размова ідзе аб тэрыторыях ад Пінска ў бок Мазыра. «Мазыр мы не будзем чапаць: гэта багаты раён, яны там справяцца, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — А вось пачынаць трэба ад Пінска, праз Давыд-Гарадок, Петрыкаў, у бок Мазыра — трэба падумаць. Што тут думаць? Трэба рабіць так, як у яго (дырэктара ААТ «Парахонскае» Уладзіміра Храленкі. — **«Зв.»**)».

Менавіта ААТ «Парахонскае» Аляксандр Лукашэнка лічыць узорным сельгаспрадпрыемствам, дзе дасягнуты высокі ўзровень гаспадарання і развіцця сацыяльнай сферы. «Чыста, прыгожа», — даў ацэнку кіраўнік дзяржавы.

Курыраваць пытанне адраджэння Палесся Аляксандр Лукашэнка даручыў упаўнаважанаму прадстаўніку кіраўніка дзяржавы ў Брэсцкай вобласці Міхаілу Русаму. Дапамагчы ў арганізацыйным і рэкамендацыйным плане даручана кіраўніку ААТ «Парахонскае». Асобныя задачы будуць пастаўлены ўраду і кіраўніцтву вобласці.

«Зробіце за пяць гадоў — вы героі, — сказаў Прэзідэнт. — Трэба зрабіць, як у «Парахонскім». Кідаць не трэба гэтую праграму. Калі мы Палессе прывядзём у парадак, мы толькі за кошт Палесся накормім усю краіну. Палессе кінуць нельга».

«Будзем разбірацца, і прытым прынцыпова»

Падчас наведвання гаспадаркі кіраўніку дзяржавы далажылі аб завяршэнні ўборкі збожжавых і ходзе сельскагаспадарчых работ не толькі на Піншчыне, але і ў Брэсцкай вобласці, у краіне ў цэлым. Прэзідэнта цікавіла ўсё: які ўраджай збожжа ў выніку чакаецца, якая ўраджайнасць цукровых буракоў, калі з палёў краіны збярэцца бульба, якія экспартныя цэны на нашу гародніну, наколькі забяспечаны гароднінай унутраныя рынкі? Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся праблемамі, якія існуюць у кожным канкрэтным рэгіёне Беларусі.

Прэзідэнту паведамілі, што валавы збор збожжа чакаецца больш як 10 мільёнаў тон, агульны намалот кукурузы на зерне — у аб'ёме 2 мільёнаў тон. Усе планы па дзяржзаказе выкананы. Завяршаецца ўборка цукровых буракоў. Ураджайнасць — прыкладна на ўзроўні мінулага года: спякота і недахоп вільгаці ўнеслі свае карэктывы. Тым не менш патрэбы вытворцаў цукру гарантавана забяспечаны. Як далажылі кіраўніку дзяржавы, цяпер цукар добра ідзе на экспарт, складваецца нядрэнная кан'юнктура цэн.

Што датычыцца другога хлеба — бульбы, уборку плануецца завяршыць у сярэдзіне кастрычніка. Ужо цяпер для ўнутранага спажыўца бульбы нарыхтавана дастаткова, ідуць пастаўкі на экспарт. На 100 % выкананы дзяржзаказ па алеянасенні рапсу, піваварным ячмені. У цэлым, як далажылі кіраўніку дзяржавы, уборачная ідзе ў рамках намечаных планаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што важна не толькі сабраць ураджай, але і правільна яго нарыхтаваць і захаваць. «Па якасці будзем разбірацца ў тым ліку, — папярэдзіў ён. — Нам «гнілаж» не патрэбны, нам патрэбны нармальныя кармы».

У цэнтры ўвагі Прэзідэнта — і сяўба азімых, што, па яго словах, з'яўляецца залогам будучага ўраджаю. Аб адказнасці ў гэтым плане, найперш звязанай з несвоечасовымі работамі, кіраўнік дзяржавы жорстка папярэдзіў. Завяршыць сяўбу ўсюды плануюць да 15 кастрычніка, што не зусім адпавядае ўстаноўленым планам. Аднак сітуацыя па рэгіёнах адрозніваецца. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці гэтыя работы ўжо поўнасцю завершаны.

«А што, у Віцебску можна сеяць пазней, чым у Брэсце? — пацікавіўся беларускі лідар. — Па ідэі ў вас у канцы верасня ў Віцебску ўсё павінна быць скончана. Добра, будзем разбірацца, і прытым прынцыпова. Мне трэба, як павінна быць! Колькі мы будзем «размандыкваць» па гэтых пытаннях? «Мы не пасеялі...» А што перашкаджала пасеяць да 1 кастрычніка?».

«Калі яшчэ возьмемся за сою на Палессі — цуд будзе»

Прэзідэнту далажылі аб вытворчай дзейнасці і перспектывах развіцця ААТ «Парахонскае». Кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся рознымі аспектамі і вопытам работы сельгаспрадпрыемства.

Гаспадарка размешчана на былых балотах поймы рэк Прыпяць, Ясельда і Бобрык. Першыя меліяраваныя землі былі перададзены саўгасу «Парахонскае» ў красавіку 1974 года. Меліярацыйныя работы працягваліся тут дзесяць гадоў. Вынікам меліярацыі стала стварэнне саўгаса «Парахонскае» з агульным аб'ёмам меліяраваных зямель 14 тысяч гектараў.

Да 1991 года гаспадарка дынамічна развівалася. На яе балансе знаходзілася звыш 14 тысяч галоў жывёлы, у тым ліку 2,5 тысячы кароў. У гэты час былі пабудаваны чатыры жывёлагадоўчыя комплексы, з'явілася сацыяльная сфера і была палепшана інфраструктура населенага пункта. Затым — рэзкае падзенне колькасці пагалоўя, а адпаведна, і вытворчасці. Аднак заняпад быў не доўгім: плячо дапамогі сельскай гаспадарцы падставіла дзяржава. Упершыню за многія гады пачалася закупляцца новая тэхніка, пачаліся рамонтныя работы і рэканструкцыя жывёлагадоўчых памяшканняў, палепшылася сацыяльная сфера. Прыйшло разуменне таго, што жыць і зарабляць на меліяраваных землях можна і трэба. І людзі, як гэта звычайна бывае, пачалі не з'язджаць у гарады, а, наадварот, пасля заканчэння сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў вяртацца ў родны аграгарадок, на працу ў ААТ «Парахонскае».

Цяпер гэта адно з найбольш паспяховых прадпрыемстваў краіны, якое спецыялізуецца на раслінаводстве і жывёлагадоўлі. Створана магутнае прадпрыемства

Пасля знаёмства з навучальным працэсам у Парахонскай сярэдняй школе кіраўнік дзяржавы пагутарыў з жыхарамі аграгарадка

«Палессе трэба адраджаць»

Прэзідэнт нагадаў, што 20 гадоў не быў у Парахонску. Ен заўважыў, што за гэты час у населеным пункце зроблена многае, за што ў адрас жыхароў прагучалі асобныя словы ўдзячнасці.

«Шчыра кажучы, я прыехаў для таго, каб душой адпачыць і прыняць сур'ёзнае рашэнне па развіцці нашага Палесся, — адзначыў беларускі лідар. — Мы дамовіліся, што Міхаіл Іванавіч Русы возьме на сябе кантроль за выкананне праграмы «Адраджэнне Палесся», а ваш кіраўнік будзе ў яго галоўным дарадцам-кансультантам — як уладкаваць Палессе. Больш не трэба, чым у «Парахонскім». Няхай усюды будзе так на Палессі».

Прэзідэнт яшчэ раз падчас наведвання Пінскага раёна засяродзіў увагу на тым, што калі Палессе будзе развіта, як гэта гаспадарка, то яно адно зможа пракарміць усю краіну... Усё астатняе, па яго словах, можам прадаваць. Аднак не ўсё Палессе можа пахваліцца высокімі вынікамі, як «Парахонскае», таму, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, яго трэба прыводзіць у парадак. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што калісьці праграма па адраджэнні гэтага рэгіёна была прынята, аднак, на думку Прэзідэнта, гэтага недастаткова.

«Трэба проста вярнуцца да таго, што зроблена, трэба прыняць рашэнне, сканцэнтраваць грашовыя сродкі і паглядзець, што вы ўкладзяце, а што мы з цэнтра дапаможам, — канкрэтызаваў ён. — Але Палессе трэба адраджаць, трэба прыводзіць яго ў парадак. Не трэба распыляць сродкі грашовыя. У нас вельмі вялікае распыленне: мы ўсім хочам дапамагчы, а калі распыляеш сродкі — у выніку тры-пяць гадоў, глядзіш, калі нешта зрабілі, то для дзяржавы гэта нішто. Таму трэба канцэнтраваць грашовыя сродкі, рэсурсы і іншае на асноўных кірунках».

У гэтай сувязі Прэзідэнт прывёў у прыклад паўднёвы ўсход краіны, дзе дзейнічае праграма падтрымкі. Па словах кіраўніка дзяржавы, яна будзе ўзмоцнена. Такім чынам, як засяродзіў ён увагу, трэба вярнуцца да адраджэння Палесся і падумаць, што рабіць у Віцебскай вобласці.

«Вы — малайцы, увогуле нядрэнна спрацавалі, — даў ацэнку кіраўнік дзяржавы ў цэлым Брэсцкай вобласці, кажучы аб сельскагаспадарчых поспехах. — Ваш губернатар стаў віцэ-прэм'ерам ва ўрадзе, у вас новы губернатар, ён жа генеральны дырэктар нашага БелАЗа, самыя магутныя аўтамабілі ён рабіў, быў віцэ-прэм'ерам. Я яму ўдзячны, што ён (Пётр Пархомчык. — **«Зв.»**) рашыўся ўзначаліць Брэсцкую вобласць. Гэта вельмі цяжкая работа губернатара».

Прэзідэнт нагадаў, што ў суботу адбудуцца абласныя «Дажынкі» і агучыў сваё жаданне праехаць па ўсіх абласцях, каб, як калісьці, падзякаваць сялянам. «Вы — малайцы, — звярнуўся ён да палешукоў, маючы на ўвазе ўсіх людзей, якія працуюць у аграпрамысловым комплексе краіны. — Я не памыліўся, калі казаў, што без селяніна, без вёскі няма краіны. І вы кожны год (нават у крутыя 2020-я гады) паказалі, што вы сапраўдныя, моцныя людзі. Вы не падвялі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што жыхары Парахонска жывуць у райскім кутку. «Вам можа пазайздросціць любы гараджанін, — лічыць ён. — Не трэба нікуды імкнуцца, не трэба сваіх дзяцей адпраўляць у нейкія гарады, ніхто нікога там не чакае. Там, дзе нарадзіўся, — там і спатрэбіўся».

Прэзідэнт бачыць, што ў жыхароў Палесся настрой у цэлым нядрэнны і яны жывуць у добрых умовах. «І калі ваш кіраўнік, які некалі прыехаў з Расіі, пасяліўся тут і стварыў тут такую жамчужыну, як «Парахонскае», дапаможа нам ажывіць Палессе, я яму буду ўдзячны, гэта значыць, герой, — канстатаваў беларускі лідар. — Вы гэта заслужылі, гэта ваш вялікі ўклад, што ў вас кіраўнік такі». Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што кіраўнікоў не ўсе любяць, звычайна іх цэняць тады, калі яны сыходзяць.

«Вы, напэўна, задаволены і рады, бо гэта найвышэйшы ўзровень, не скажу еўрапейскі — сусветны, — даў ацэнку сельгаспрадпрыемству Аляксандр Лукашэнка. — Такога ўвогуле няма ні ў свеце, ні ў Еўропе. У іх іншыя зусім сельгаспрадпрыемствы. А вы — малайцы. 20 тысяч гектараў — гэта трэцяя частка буйнога раёна Беларусі. Таму малайцы, дзякуй вам».

«Галоўнае для нас цяпер — аднавіць усе меліярацыйныя сістэмы і палі»

Карыстаючыся магчымасцю, мясцовыя жыхары задалі кіраўніку дзяржавы пытанні. Меліяратар ААТ «Парахонскае» пацікавіўся, ці будзе дзяржава аказваць падтрымку па будаўніцтве дадатковых гідразбудаванняў.

«Сапраўды, я часам дапамагаю ў дэталях, але ўвогуле патрэбна буйная праграма: Прэзідэнт павінен рэалізоўваць і вызначаць буйныя праграмы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Калі раней была праблема з пераўвільгатненнем, то цяпер засуха б'е па Беларусі. І мы ўжо закраналі гэту праблему. Нядаўна на нейкай нарадзе я ўжо даручыў людзям падумаць над тым, што мы будзем рабіць. Гэта ж не справа, што Палессе засушыла. У нас Прыпяць — вялізная колькасць вады, а вакол — сушняк. Гэта не справа».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт расказаў аб эксперыменце на сваіх палетках, калі ў засуху выкарыстоўваецца палівальная ўстаноўка. «Цудоўная трава расце, — кажа ён. — Гэта значыць, патрэбна вільгаць. Таму мы падумаем, як аказаць падтрымку вам і асабліва Гомельскай вобласці. Здавалася б, вады мора, такія рэкі (Днепр і Сож там), а вільгаці не хапае. Нам трэба падумаць, як быць».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы прывёў вопыт Таджыкістана, калі вада падаецца ў горы з рэк. Магчыма, і мы, па словах кіраўніка дзяржавы, падыдзем да таго, што нам давядзецца пампаваць ваду з рэк. «Дзякуй Богу, у нас ёсць, адкуль пампаваць, — заўважыў беларускі лідар. — 11 тысяч, кажуць, азёр і тысяч 20 з лішкам рэк, таму аб'ёмы вады вялізныя. Вада ў нас вельмі добрая, гэта ўжо сёння багацце. Не нафта і газ, а менавіта вада і далей каштоўнасць яе будзе яшчэ большай. Падумаем, паглядзім».

Указаў Прэзідэнт і на праблему паплаўных земляў. У гэтай сувязі ён згадаў адну са сваіх першых камандзіровак у статусе кіраўніка дзяржавы, калі разам з жыхарамі давялося касіць траву ў пойме Прыпяці. «Ужо рэдка хто косіць, а гэта вялізныя-вялізныя плошчы, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ляціш над краінай, і сэрца крывёю абліваецца, калі бачыш гэтыя землі, якія зараслі і пустуюць. Еўропе добра, яны рады, бо балоты — гэта кісларод. Ім добра. Нам таксама нядрэнна, але хацелася б гэта ўцягнуць у абарот, каб дабро было не толькі еўрапейцам, якія паскудзяць нам часцей, чым дапамагаюць, але і каб мы атрымалі большую аддачу».

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што меліяратар падняў вельмі важнае пытанне, над якім дзяржава будзе думаць. «Можа быць, дзесьці з рэк на нейкія палі давядзецца падводзіць ваду, каб іх арашаць: ураджай гэта ўсё акупіць, — канстатаваў Прэзідэнт. — Таму будзем паціху дапамагаць, але галоўнае для нас цяпер — аднавіць усе меліярацыйныя сістэмы і палі, дзе вы ўжо самі не адновіце ў Беларусі. Вы — малайцы: у вас атрад меліярацыйны ёсць, у вас тэхніка ёсць, вы глядзіце за гэтымі каналамі, не ўсюды так было. Мы гэта ўсё аднаўляем і наводзім парадак для таго, каб вярнуць да жыцця тыя меліярацыйныя плошчы і сістэмы, якія былі калісьці ў нас, у тым ліку і тут, на Палессі».

«Калі ўсе гаспадаркі будуць паказваць такія добрыя вынікі, як «Парахонскае», вайны не будзе»

Наступнае пытанне ад жыхароў прыгранічча — пытанне бяспекі: людзей непакоіць засяроджанне войскаў з боку суседзяў і ўзмацненне граніцы з нашага боку.

У гэтай сувязі кіраўнік дзяржавы прапанаваў звярнуцца да гісторыі. Ен звярнуў увагу на тое, што, калі б у 1941 годзе «не прашлёпалі ў Крамлі», вайны такой бы не было. «Яны не рыхтаваліся да вайны, таму за паўгода фашысты былі пад Масквой, — канстатаваў беларускі лідар. — Таму не трэба паўтараць памылкі, трэба быць гатовымі. Яны (украінцы. — **«Зв.»**) там напружваюцца (войскамі і іншае) —

МЫ ТОЛЬКІ ЗА КОШТ ПАЛЕССЯ НАКОРМІМ УСЮ КРАІНУ»

з устойлівай эканамічнай базай, вытворчасцю, якая пастаянна абнаўляецца. За мінулы год тут было выраблена 53 190 тон малака, прададзена 7050 тон ялавічыны. Атрымана прыбытку звыш 14 мільёнаў рублёў пры рэнтабельнасці 17,5 %. Штогод гаспадарка інвестуе мільёны рублёў на рэканструкцыю і будаўніцтва новых аб'ектаў.

Прэзідэнт пацікавіўся працэсам вырошчвання соі на тэрыторыі сельгаспадаркі, які, як заўважыў яе кіраўнік, ідзе вельмі паспахова, нават нягледзячы на тое, што расце гэтая культура на меліяраваных землях. «Калі яшчэ возьмемся за сою на Палессі — цуд будзе», — заўважыў беларускі лідар.

«Вось золата. Не так проста гэтае насенне атрымаць»

Асаблівага пераймання заслугоўвае вопыт нарыхтоўкі і захоўвання траў, напрацаваны ў ААТ «Парахонскае». Аб гэтым кірунку дзейнасці падрабязна праінфармавалі Прэзідэнта. Яшчэ адзін запатрабаваны кірунак — насенняводства шматгадовай травы, што мае вялікае значэнне для забеспячэння кармамі жывёлагадоўчага сектара. Аляксандр Лукашэнка пабываў у насеннесховішчы і, запусціўшы руку ў адзін з мяшкоў з насеннем, сказаў: «Вось золата. Не так проста гэтае насенне атрымаць. Гэта — золата».

Акрамя таго, Прэзідэнту прадэманстравалі меліярацыйную тэхніку, якая знаходзіцца на балансе сельгаспрадпрыемства, азнаёмілі з вытворчасцю вітамінна-травяных гранул. Завод па вытворчасці травяных гранул кожны год замяняе сваёй прадукцыяй звыш 4 тысяч тон закупнога збожжа. Такім чынам, прадпрыемства поўнасцю забяспечана ўласнай кармавой базай. У 2021 і 2023 гадах гаспадарка закупіла дзве лініі па вытворчасці такіх гранул. Сабекошт тоны гэтай прадукцыі выходзіць на 30 % танней за збожжа. Як паведаміў кіраўнік ААТ «Парахонскае», за ўвесь перыяд вытворчасці травяных гранул рэалізаваны праект акупіўся на 80 %. Аляксандр Лукашэнка даў станоўчую ацэнку гэтаму падыходу, які можа быць запатрабаваны і ў іншых рэгіёнах. Напрыклад, у Віцебскай вобласці, дзе ўраджаі збожжа невысокія.

«Трэба заахвочваць, калі чалавек будуе сваё»

Прэзідэнту расказалі аб рабоце малочнатаварных комплексаў, якія знаходзяцца на балансе гаспадаркі. «Карове трэба паставіць помнік, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Дзякуючы карове партызаны выжывалі і дзеткі. Пасля вайны дзякуючы карове мы выжылі. І цяпер яна нас корміць. Карова — гэта святое. Для мяне гэта святое».

Падчас наведвання гаспадаркі Прэзідэнт узняў пытанне забеспячэння жыллём на сяле. «Мы ўзмоцнім яшчэ падтрымку сяла, — падкрэсліў ён. — Па жыллі мы ўзмоцнім. Трэба будаваць жыллё там, дзе трэба для вытворчасці, дзе ёсць работа чалавеку».

Па меркаванні беларускага лідара, для работнікаў неабходна будаваць арэнднае жыллё. Гэта, па яго словах, нароўні з годным заробкам заклікана стварыць умовы для прыцягнення спецыялістаў. «І распрадаўцам гэтым жыллём павінен кіраўнік гаспадаркі, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Ты запрашаеш на работу, дагавор заключаеш. Пайшоў — вызваляй жыллё. Мы павінны будаваць арэнднае жыллё».

Але такі падыход, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, не адмяняе і магчымасці будаўніцтва ўласнага жылля, калі людзі гэтага жадаюць. «Чалавек калі стане будаваць — зямлю будзем даваць, участкі, — сказаў Прэзідэнт. — Гэта трэба заахвочваць, калі чалавек будуе сваё. Але калі не хапае людзей і табе трэба людзі, то ты прыцягнуць можаш і за кошт жылля, і зарплаты. Гэта перш за ўсё».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што падобныя патрабаванні павінны адносіцца да работнікаў не толькі АПК, але і іншых галін. Ен падкрэсліў, што не трэба сцягваць усе працоўныя рэсурсы ў гарады ва ўрон сельскім тэрыторыям. «Нам трэба ўлічыць жалезабетонна, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — А так мы ў Мінск збіраем людзей, а потым думаем, а як жа іх заняць, а як школы пабудаваць, а як дзіцячыя садкі... І пайшло-паехала».

«Нам трэба сур'ёзна падумаць над гэтым пытаннем»

У аграгарадку Парахонск кіраўнік дзяржавы і тыя, хто яго суправаджаў, усклалі кветкі да памятнага знака «Смутак і Мужнасць».

Затым у маршруце Аляксандра Лукашэнкі была Парахонская сярэдняя школа. Дырэктар навучальнай установы Мікалай Калесніковіч расказаў аб арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і рэалізацыі адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі кадраў для арганізацый аграпрамысловага комплексу.

Парахонская сярэдняя школа адчыніла свае дзверы ў 1977 годзе. Дзякуючы праграме адраджэння і развіцця вёскі ў 2010 годзе яна набыла сучасны выгляд. Ва ўстанове навучаюцца 356 дзяцей. Навучальная ўстанова ў поўным аб'ёме ўкамплектавана педагагічнымі кадрамі.

Звяртаючыся да дырэктара школы, Прэзідэнт расказаў, што на працягу некалькіх гадоў заклапочаны адной праблемай, якая датычыцца школы. «Вышэйшая і першая кваліфікацыйная катэгорыя, ёсць другая, — сказаў ён. — Гэтая катэгарыйнасць, якая ў нас у школах уведзена, адлюстроўвае рэальную карціну? Гэта значыць, нам не трэба нічога перарабляць?»

Па словах дырэктара школы, перарабляць нічога не варта. Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што пакуль не ведае, ці патрэбны тут нейкія пераўтварэнні, таму цікавіцца меркаваннем спецыялістаў. «Нам трэба сур'ёзна падумаць над гэтым пытаннем», — патлумачыў ён.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з арганізацыяй адукацыйнага працэсу і матэрыяльна-тэхнічнай базай школы, пагутарыў з педагогамі і навучэнцамі. Яму расказалі, што ў школе створана група аграрнай накіраванасці — мяркуецца, што ў перспектыве гэтыя дзеці прыйдуць працаваць у сваю гаспадарку.

«Вы — унікальныя будучыя бацькі, і ў вас будуць добрыя жонкі, — звяртаючыся да вучняў, якія працавалі за сталярнымі станкамі, сказаў Прэзідэнт. — Моладзь не ўмее гэтага ўсяго ў горадзе. Малайцы!»

У падарунак ад Прэзідэнта навучальнай установе быў перададзены спартыўны інвентар і абсталяванне для гімнастыкі, лёгкай атлетыкі, зімовых відаў спорту, спартыўных і рухомых гульняў. Таксама кіраўніцтва школы атрымала сертыфікат на набыццё варкаўт-пляцоўкі.

мы ў адказ. Мы робім усё ў адказ. Мы ніколі не ініцыявалі нейкае супрацьстаянне. Ні ў якім разе. Нам гэта не патрэбна. Ну каму з нас трэба вайна? Што такое вайна? Гэта катастрофа. Я не хачу, каб была вайна, і таму мы робім усё для таго, каб мірна скончылася гэта».

Па словах кіраўніка дзяржавы, па пэўных каналах кантакты з украінцамі падтрымліваюцца. Абмяркоўваюцца і гуманітарныя пытанні. Напрыклад, у Беларусі рэгулярна ажыццяўляецца аздараўленне дзяцей з Украіны. Пры гэтым нашага Прэзідэнта абвінавачваюць у тым, што ён «крадзе дзяцей». Аднак, па словах кіраўніка дзяржавы, палітыка для Украіны больш важная, чым дапамога іх жа жыхарам, якую гатовы аказаць у Беларусі.

«Мы ні ў якім разе не эскаліруем сітуацыю, нам гэтая эскалацыя не патрэбна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Аднак беларускі бок, па словах кіраўніка дзяржавы, добра ведае, калі і дзе на сумежным боку ідзе засяроджванне ўзброеных сіл. «Хто ведае, для чаго яны ў кучу збіраюць вайскоўцаў і тэхніку згоняюць? — заўважыў Прэзідэнт. — Але як толькі нейкае напружанне з таго боку, я выстаўляю заслон сваімі вайскоўцамі. Мы не проста сабралі іх тут, перакрылі граніцу — гэта само сабой. Гэта і трэніроўка добрая. Яны павінны быць гатовымі да вайны. Не дай Бог, каб гэта вайна была, але яны павінны быць гатовы. Калі праціўнік бачыць, што мы гатовыя, дакладна нападаць не будзе».

Прэзідэнт параіў мясцовым жыхарам не хвалявацца. «Мы не збіраемся ваяваць з украінцамі, і яны не хочуць з намі ваяваць, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Куды ім яшчэ гэтая «абуза»? А нам наогул вошта? Там жа нашы людзі жывуць. Мы будзем рабіць усё для таго, каб суіснаваць з Украінай мірна, калі яны гэтага хочуць. Народ гэтага хоча, але пакуль вярхушкай Украіны, кажуць, кіруюць амерыканцы. Вы самі ведаеце, што кіруюць. І калі нешта трэба, Валодзя Зяленскі ляціць у Вашынгтон. Ён не едзе ў Мінск ці Маскву, каб дамовіцца і ў рэшце рэшт скончыць гэту вайну. Яны думаюць, што амерыканцы адновяць Украіну пасля вайны і яны будуць заможнымі, моцнымі і мудрымі. Ніхто іх аднаўляць не будзе. Улада памяняецца, і скажуць: «Валодзя, хто ты такі?» Вунь ужо што Трамп кажа. Таму кіраўніцтву Украіны трэба ўзяць галаву ў рукі і зразумець, што ім перш за ўсё трэба будзе аднаўляць краіну. З дапамогай блізкіх ім людзей, перш за ўсё Беларусі».

Звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы і на тое, як адносяцца да ўкраінцаў палякі. «Успомнілі ім валынскую разню, — канкрэтызаваў ён. — Слухайце, у гады вайны чаго ні было, украінцы ў нас Хатынь спальвалі. Тое, што яны рабілі на Прыпяці, — гэта кашмар, кіруемыя фашыстамі. Дык што, мы будзем тым часам жыць усё жыццё, да смерці?»

Прэзідэнт патлумачыў, што ў аснове ўсяго гэтага ляжыць жаданне палякаў прыхапіць Заходнюю Украіну, па аналогіі з Заходняй Беларуссю. «Для нас гэта непрымальна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Маю заяву на гэты конт вы павінны ведаць. Калі толькі палякі ўлезуць ва Украіну і паспрабуюць Захад адцяць, мы будзем украінцаў падтрымліваць, бо мы разумеем, што наступнымі будзем мы».

Па словах кіраўніка дзяржавы, цяпер галоўнае для Беларусі — эканоміка. «І калі ўсе гаспадаркі будуць паказваць такія добрыя вынікі, як «Парахонскае», вайны не будзе», — перакананы беларускі лідар.

«Збіць верталёт Прэзідэнта — гэта вайна»

Падчас размовы з людзьмі адзін з журналістаў задаў кіраўніку дзяржавы пытанне, звязанае з тым, што напярэдадні візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Пінскі раён у СМІ з'явілася інфармацыя, што адначасова з верталётам кіраўніка дзяржавы ў паветранай прасторы Беларусі былі заўважаны два беспілотнікі. «Ці магло гэта паведамленне быць наўмыснай спробай стварыць напружанне, настроіць беларусаў супраць расіян або ўкраінцаў і што сам Прэзідэнт думае наконт гэтай сітуацыі?» — канкрэтызаваў палітычны аглядальнік тэлеканала АНТ Ігар Тур.

«Каб адмесці ўсялякія інсінуацыі наконт майго верталёта, дронаў і іншага: гэта не мае праблемы, гэта праблемы Службы бяспекі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Няхай яны глядзяць, дзе дроны лётаюць і куды верталёты Прэзідэнта ляцець. Я сапраўды да гэтага так стаўлюся».

Па словах кіраўніка дзяржавы, калі раніцай перад вылетам у Пінскі раён яму сталі дакладваць аб сітуацыі і надвор'і, ён запатрабаваў абмяркоўваць гэтыя пытанні непасрэдна з пілотамі і разам з імі прымаць рашэнне. У выніку было вырашана адкласці вылет на гадзіну ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я.

«Гляджу, ляцелі яны вельмі нізка, незвычайна нізка, — заўважыў беларускі лідар. — Напэўна, каб электроннымі сродкамі з Украіны не было відаць. Вядома, яны верталёт бачаць: ён жа вялікі, гэта ж не беспілотнік. Нармальна прыляцелі. Таму я тут асабліва не паруся, як у народзе гавораць, з гэтай нагоды. І потым, ведаеце: збіць верталёт Прэзідэнта — гэта вайна, якая ўкраінцам не патрэбная».

Кажучы аб беспілотніках, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гэта ўзбраенне — ужо не навінка. Аднак так масава ў якасці асноўных сродкаў паражэння дроны яшчэ не прымяняліся. «І Украіна, і Расія цяпер закупляюць вялікую колькасць БПЛА, аднак не менш важнае пытанне — навучыцца кіраваць імі, — лічыць кіраўнік дзяржавы. — Таму даволі часта ў неспрактыкаваных руках і пасля ўздзеяння сродкаў радыёэлектроннай барацьбы беспілотнікі губляюць арыенцір».

Такім чынам, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, яны і заляталі ў Беларусь. «Некалькі выпадкаў такіх было і з боку Расіі, і з боку Украіны, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Шмат мы збіваем. Мы не глядзім, расійскія гэта або ўкраінскія».

У Беларусі сталі вырашаць гэтыя пытанні на ўзроўні спецыялістаў, не выносячы ў публічнае поле. Такія дамоўленасці былі дасягнуты і з абодвума бакамі.

«Я нават здзівіўся, калі атрымаў інфармацыю, — падзяліўся Прэзідэнт. — Гэта нашы збеглыя з-за мяжы пачалі падкідваць: насустрач прэзідэнцкаму борту вылецелі беспілотнікі. Думаю, што гэта дробная брыдота, правакацыя. Трэба разумець, што мы знаходзімся на фронце: зусім побач, вось за плотам, ідзе вайна. Таму мая галоўная задача — не дапусціць уцягвання ў гэту бойку, у гэту вайну Беларусі».

«Мы ганарыцца гісторыяй павінны, што мы і робім»

Настаўнік Парахонскай сярэдняй школы звярнуў увагу на тое, што дзяржава прыкладае вялікія намаганні па недапушчэнні гераізацыі нацызму, па захаванні гістарычнай памяці. Аднак на Захадзе спрабуюць нам навязаць свае каштоўнасці.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што як гісторык ён даўно заўважыў: гісторыя цыклічная, і ўсе падзеі ў свеце паўтараюцца, прычым развіваюцца па спіралі. «Вось і цяпер Захад ізноў спрабуе забяспечыць сваю будучыню за чужы кошт, а самай вялікай кладоўкай рэсурсаў сёння з'яўляецца Расія, — заўважыў ён. — Лёс у нас такі. А мы — на шляху. Усё паўтараецца. Яны хочуць гэтага».

Па словах кіраўніка дзяржавы, перш за ўсё нам хочуць залезці ў галаву, перафарматаваць, усё зламаць. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што беларусам, якія ўжо пажылі пэўны час, у галаву не залезеш, часо не скажаш пра моладзь. Невыпадкова Прэзідэнт, іншыя высокія службовыя асобы сустракаюцца з моладдзю, каб патлумачыць ім, што вакол адбываецца.

«Яны (на Захадзе. — **«Зв.»**) хочуць, каб мы забылі гісторыю, — канстатаваў беларускі лідар. — А ў нас гераічная гісторыя. Мы павінны яе не проста памятаць — мы ганарыцца гэтай гісторыяй павінны, што мы і робім».

Усё, па словах Прэзідэнта, пачынаецца з простага — спачатку неабходна сфарміраваць у чалавека спажывецкія паводзіны, а затым перапісаць гісторыю. «Гэта значыць, нас хочуць перакадзіраваць, перафарматаваць, нас хочуць зрабіць іншымі — Іванамі, якія не памятаюць радства свайго, — падкрэсліў ён. — Гэта крокі да галоўнай мэты: нас ізноў хочуць скарыць, паставіць на калені. Нас ізноў хочуць прымусіць рабіць тое, што ім трэба, каб жыць за наш кошт. Вось у чым праблема. Таму нам трэба жыць сваім розумам, як палешукі».

Кажучы аб палешуках, мудрых і памяркоўных людзях, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на гэтай зямлі жывуць сапраўдныя беларусы. «Працаздольныя, прыгожыя, разумныя, умеюць рыбу лавіць, скаціну гадаваць — усё ўмеюць рабіць, — канстатаваў беларускі лідар і нагадаў, як у пачатку 1990-х гадоў тут хацелі стварыць «беларускую палескую рэспубліку». — Я тады прыехаў і ўбачыў, што гэта цудоўныя людзі. Адзін мужык кажа: «Дайце яму касу». Знайшлі чым мяне палохаць: я з вёскі сам. Касіць з імі — касіў. Потым жанчыны — граблі дадзім. Давайце граблі. Нешта абедаць пачалі. І я, на шчасце, з сабой узяў перакусіць, усе ссабойку расклалі, і я таксама там з імі сяджу. І чую адзін мужык — другому: «Гэта наш». І пасля гэтага я больш не чуў ніякіх размоў аб нейкай «палескай рэспубліцы». Гэтыя палешукі, якіх ужо сёння няма і якія ёсць, яны заўсёды мяне падтрымлівалі. Таму мая ўдзячнасць — яна з тых 1990-х гадоў».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сур'ёзна возьмуцца за Палессе. «Вам будзе нялёгка, нам будзе нялёгка, але для дзяцей і ўнукаў вашых мы павінны Палессе прывесці ў парадак», — рэзюмаваў беларускі лідар.

У завяршэнні сустрэчы ад супрацоўнікаў гаспадаркі і жыхароў аграгарадка Прэзідэнту падарылі карціну, якую напісалі пінскія майстры. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў і пажадаў мясцовым жыхарам здароўя. «Усё астатняе мы купім», — сказаў ён.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

Пінскі раён.

Аляксандр СУБОЦІН:

«ГЭТА АДЗІН З САМЫХ ВЫСОКІХ БІЯТЭХНАЛАГІЧНА НАЛАДЖАНЫХ АБ'ЕКТАЎ»

Учора ў Докшыцкім раёне ў ААТ «Бягомльскае» адкрылася пасля рэканструкцыі малочнатаварная ферма «Добрунь»

Рэканструкцыю жывёлагадоўчага комплексу пад малочнатаварную ферму праводзілі ў рамках рэалізацыі Указа Прэзідэнта ад 28 снежня 2022 года № 442-дсп «Аб будаўніцтве (рэканструкцыі) малочнатаварных комплексаў». У адпаведнасці з дакументам у кожным раёне краіны павінна быць пабудавана па дзесяць такіх аб'ектаў. Ферма «Добрунь» стала першай з дзясятка адабраных у рамках указа. Распрацаваны праект даў магчымасць максімальна эфектыўна задзейнічаць існуючыя будынкі і збудаванні і дапоўніць іх будаўніцтвам новых аб'ектаў, арганізаваць замкнуты цыкл вытворчасці і стварыць 12 новых рабочых месцаў.

Фота БелТА.

Цырымонія адкрыцця аб'екта адбылася пры ўдзеле намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Ягорава, старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Субоціна, старшыні праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргея Сталярчука, прадстаўнікоў мясцовай улады, прадпрыемстваў і арганізацый, маладых спецыялістаў сельскай гаспадаркі, навучэнцаў профільных агракласаў і груп.

«Малочнатаварная ферма «Добрунь» ААТ «Бягомльскае» ў Докшыцкім раёне — прыклад руплівага стаўлення да фінансавых сродкаў і людзей, якія тут працуюць», — заявіў журналістам на адкрыцці малочнатаварнай фермы **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН**.

Частку сродкаў удалося сэканоміць і накіраваць на іншыя мэты. Таксама сэканомленыя грошы пайшлі на будаўніцтва цялятнікаў, асфальтаванне — усё гэта тут выконвалі сваімі сіламі. «Гэта таксама паказчык, што можна эканоміць там, дзе максімальна сціскаліся сродкі, каб выгадна пабудаваць гэты комплекс», — заўважыў старшыня аблвыканкама.

Ён зазначыў, што сёлета дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта ў паўночным рэгіёне павінны здаць 10 комплексаў, дзе будзе «прыжывацца самая сучасная тэхналогія па вытворчасці малака». Такая ж колькасць значыцца ў плане на наступны год. У некаторых выпадках пачата ўжо не толькі праектаванне, але і будаўнічыя работы. Усяго ж, як растлумачыў Аляксандр Субоцін, у рэгіёне запланавана мадэрнізацыя і будаўніцтва 138 новых комплексаў.

Канкрэтныя аб'екты адбіралі з улікам таго, ці ёсць на месцах людзі, здольныя зрабіць адпаведную тэхналогію, і дзе ёсць перспектыва рэалізаваць гэты праект. Размова не толькі аб будаўніцтве, але і аб запаўненні фермы жывёламі. «Жывёлы павінны быць адабраны па генетычных характарыстыках і павінен быць забяспечаны ўвесь цыкл высокатэхналагічнай вытворчасці малака. Быццам бы мы думаем, што гэта сяло, а вось гэта адзін з самых высокіх біятэхналагічна наладжаных аб'ектаў. Тут і генетыка ўлічваецца, і лячэбная справа з пункту гледжання ветэрынарыі (ад вакцынацыі да апрацовак), і тэхналогіі даення, кармлення, нарыхтоўкі кармоў — тут столькі тонкасцяў», — адзначыў Аляксандр Субоцін.

Будаўнічыя работы на аб'екце стартавалі ў снежні 2023 года. Праект прадугледжваў рэканструкцыю кароўніка пад будынак сухастойных кароў, прыбудову санітарнага прапускніка да даільна-малочнага блока, а таксама ўзвядзенне агароджы па перыметры тэрыторыі малочнатаварнай фермы. Тэрмін уводу аб'екта ў строй планаваўся не пазней за 31 снежня 2024 года, рэалізавалі праект ужо ў верасні.

Паводле БелТА.

Ураджай–2024

З НОВЫМ КАРАВАЕМ!

Сёння Брэстчына святкуе абласныя «Дажынкі» ў Мікашэвічах

На гэты раз абласны кірмаш-фестываль працаўнікоў вёскі Брэсцкай вобласці праходзіць у Мікашэвічах Лунінецкага раёна. Горад з насельніцтвам крыху больш за 12 тысяч чалавек, вядомы найбуйнейшым у Еўропе камбінатам па здабычы будаўнічага шчэбеню, за перыяд падрыхтоўкі да свята перажыў сапраўдняе абнаўленне.

Як заўсёды, рэканструкцыя аб'ектаў інфраструктуры пачалася з пракладкі новых інжынерных камунікацый. Дарожае пакрыццё зроблена фактычна на ўсіх вуліцах горада. Абноўленае аблічча набылі многія аб'екты: папрыгажэлі фасады дамоў, атрымалі іншае напаўненне сацыяльныя ўстановы. Рамонт праведзены ў двух дзіцячых садках, школе № 2 і гімназіі. Сапраўды новы ўзровень жыцця атрымалі ўстановы аховы здароўя — бальніца, будынкі дзіцячай і дарослай паліклінік. Цяпер там сучаснае абсталяванне, зручная мэбля, камп'ютары для работы персаналу.

Капітальны і бягучы рамонт жылых дамоў праведзены з абнаўленнем фасадаў і ўнутраных камунікацый. На сценах многіх будынкаў з'явіліся арыгінальныя муралы. Не пазнаць былыя прыпыначныя павільёны, а новыя вулічныя ліхтары выглядаюць сучасна і стылёва. Добраўпарадкаваны пешаходная зона на плошчы Васіля Каржа, месцы адпачынку ў гарадскім парку, дзіцячыя пляцоўкі ў дварах. На вуліцах устаноўлены святлафоры. Адным словам, невялікі горад папрыгажэў у чаканні фестывалю.

Свята распачынаецца раніцай у суботу феерверкам кірмашоў, аглядам караваяў, тэматычнай культурнай праграмай, горадам майстроў. Кульмінацыяй яго па традыцыі стане ўручэнне заслужаных узнагарод гераям жніва. А Брэстчыне ёсць чым ганарыцца. Як паведамілі ў Брэстаблсельгасхарчы, сёлета ў вобласці намалочана з улікам рапсу больш чым 1,557 мільёна тон збожжа. На палях ход уборачнай кампаніі забяспечвалі больш за шэсць тысяч чалавек. Сотні экіпажаў камбайнераў намалацілі больш за тысячу тон збожжа, прыкладна столькі ж кіроўцаў грузавых машын вызначыліся на адвозцы хлеба. Ёсць і абсалютныя рэкардсмены. Напрыклад, Ігар Гаўрык з ААТ «Крошын» Баранавіцкага раёна намалаціў 5 тысяч тон. А Вячаслаў Трус з гэтай жа гаспадаркі перавёз больш як 7 тысяч тон збожжа. Найлепшыя з лепшых працаўнікоў, кіраўнікоў, спецыялістаў выйдуць на святочную сцэну па ўзнагароды. Чакаецца, што заслужаную ацэнку атрымаюць больш за 120 чалавек.

У праграме таксама значыцца конкурс караваяў. Арыгінальныя дажыначныя каравai прадставяць усе 16 раёнаў. Нашы пекары, як вядома, умеюць стварацъ хлебныя шэдэўры. Вось і гэтым разам яны адлюструюць багацце ўраджаю, працавітасць хлебаробаў, асаблівасці і культуру рэгіёна. Каля Палаца культуры ў Мікашэвічах будзе разгорнута выстава караваяў. Палюбавацца выпечанай прыгажосцю змогуць усе ахвотныя, а вось ацэніць работы арганізацыйны камітэт. Раён-пераможца атрымае падарунак.

Ну і пад заслону свята назавуць сталіцу абласных «Дажынак–2025». Стане вядома, куды на наступны год будуць накіраваны буйныя інвестыцыі ў справу рэканструкцыі і абнаўлення.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Актуальна

КАЛІ «АДТАЮЦЬ» БАТАРЭІ?

Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзь Трубіла паведаміў аб пачатку ацяпляльнага сезона. Асобна ён адзначыў, што кацельні цалкам гатовыя да зімы.

З першых дзён кастрычніка Мінгарвыканкам сталіцы абвясціў аб падачы цяпла ў дзіцячыя садкі, школы, бальніцы, сацыяльныя ўстановы, а таксама ў спецыялізаваныя вучэбна-спартыўныя ўстановы, архівы, бібліятэкі, гасцініцы і музеі. Як удакладнілі ў «Мінскэнерга», абноўленыя нормы дазваляюць падаваць ацяпленне ў бальніцы, садкі і школы пры сярэднясутачнай тэмпературы паветра плюс 10 градусаў на працягу трох сутак, а не пяці, як гэта было раней.

Ацяпленне жылога фонду Мінска будзе ўключана пазней. Згодна з новымі правіламі, рашэнне аб падачы цяпла ў кватэры прымаецца пры захаванні сярэднясутачнай тэмпературы паветра на ўзроўні 8 градусаў і ніжэй на працягу трох сутак запар. Таксама паведамляецца, што ацяпленне на прамысловых прадпрыемствах і ў офісах будзе ўключана пасля таго, як цяпло паступіць у жылы фонд.

Мінская вобласць таксама пачала ацяпляльны сезон з 1 кастрычніка, падключыўшы да цяпла жылыя будынкі і сацыяльныя ўстановы. У іншых рэгіёнах працэс ідзе паступова, выходзячы з фактычных тэмператур. Напрыклад, у Гродне ацяпленне ў школах, бальніцах, дзіцячых садках, музеях і бібліятэках было ўключана 3 кастрычніка ў сувязі з паніжэннем тэмпературы.

Брэсцкая вобласць таксама пачала падключэнне да цяпла 3 кастрычніка, пра што паведаміў начальнік аддзела кацельнай гаспадаркі і энергетыкі абласнога ўпраўлення ЖКГ Сяргей Ананьеў. Ацяпленне далі ў сацыяльных установах Баранавіцкага, Ганцавіцкага, Ляхавіцкага, Івацэвіцкага раёнаў, а таксама часткова ў Іванаўскім раёне.

Таксама ў пачатку кастрычніка ацяпленне падключылі ў бальніцах, школах, садках і іншых сацыяльных аб'ектах Віцебскай вобласці, паведамляе прэс-служба Віцебскага аблвыканкама. У Гомельскай вобласці цяпло ў аб'екты сацыяльнай сферы запланавана падаваць з 4 кастрычніка.

Гарадскія ўлады папярэджваюць, што сістэму ацяплення ў жылых дамах запускаюць пасля прыняцця рашэння Мінгарвыканкама, гэта можа быць на працягу пяці рабочых дзён. Пры гэтым дапускаецца разпаветрыванне сістэмы ацянлення на працягу 10 сутак пасля запуску ацяплення.

Верасень сёлета быў выключна цёплы. У «Мінскэнерга» паведамілі, што за апошнія пяць гадоў у Мінску ацяпляльны сезон стартаваў у кастрычніку толькі два разы — у 2020 і 2023 гадах. У астатнія гады — у верасні. Самае ранняе падключэнне было 20 верасня 2021-га , самае позняе — 12 кастрычніка 2020-га.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Дзярждоўг ЗША за два дні вырас амаль на $350 млрд

Дзяржаўны доўг ЗША з надыходам 2025-га фінансавага года вырас на рэкордныя $374,6 млрд за два дні. Гэта вынікае з даных, апублікаваных амерыканскім Міністэрствам фінансаў, паведаміла ТАСС. Паводле інфармацыі, у апошні дзень мінулага фінансавага года дзярждоўг ЗША складаў больш за $35,464 трлн. У параўнанні з папярэднім паказчыкам гэта больш на $143,3 млрд. 1 кастрычніка пачаўся новы фінансавы год, і дзяржаўная запазычанасць падскочыла на $204,3 млрд, перавысіўшы $35,668 трлн. У агульнай складанасці за два дні дзярждоўг вырас на $347,6 млрд, што, як адзначылі амерыканскія CMI, з'яўляецца рэкорднай лічбай. Для параўнання: з надыходам 2024-га фінансавага года ў кастрычніку мінулага года дзярждоўг ЗША за два дні вырас на $315,7 млрд.

Вялікабрытанія перадасць Маўрыкію суверэнітэт над архіпелагам Чагас

Пасля шматгадовых спрэчак Вялікабрытанія перадасць Маўрыкію суверэнітэт над размешчаным у Індыйскім акіяне архіпелагам Чагас, дзе знаходзіцца буйная амерыкана-брытанская ваенная база. Аб гэтым паведаміла Sky News. У адпаведнасці з пагадненнем аб перадачы суверэнітэту востраў-атол Дыега-Гарсія, які ўваходзіць у склад архіпелага Чагас, таксама пяройдзе Маўрыкію, аднак ваенная база, якая знаходзіцца на ім, застанецца пад юрысдыкцыяй Вашынгтона і Лондана як мінімум на 99 гадоў. У 2019-м Міжнародны суд ААН вынес рашэнне, паводле якога Вялікабрытанія павінна перадаць кантроль над Чагасам Маўрыкію. Аднак брытанскі бок выказаў нязгоду з гэтым рашэннем, пасля чаго Маўрыкій звярнуўся па падтрымку да Генасамблеі ААН. Яна прыняла рэзалюцыю, паводле якой Лондан павінен быў «вывесці сваю каланіяльную адміністрацыю» з астравоў. Аднак брытанскія ўлады спачатку гэтага не зрабілі.

Партугалія ўзмоцніць жорсткасць сістэмы кантролю за ўездам мігрантаў

Улады Партугаліі будуць збіраць біяметрычныя даныя асоб, якія прыбываюць з-за меж Шэнгенскай зоны. Аб гэтым заявіў міністр па справах прэзідэнта рэспублікі Антоніу Лейтан, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, улады Партугаліі маюць намер накіраваць «значныя інвестыцыі ў тэхналогіі і абсталяванне» для забеспячэння пагранічнага кантролю. Лейтан дадаў, што ў структуры мясцовай паліцыі плануецца стварэнне падраздзялення па справах іншаземцаў і забеспячэнні бяспекі граніц. Новы дэпартамент будзе займацца выправаджэннем тых грамадзян, якія знаходзяцца ў Партугаліі нелегальна, а таксама правядзіць інспекцыйныя аперацыі разам з Нацыянальнай рэспубліканскай гвардыяй. Раней мясцовы тэлеканал SIC Not cias паведаміў, што летась на тэрыторыі Партугаліі жылі больш за мільён мігрантаў.

У НАШАЙ БУДУЧЫНІ НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК

НАШ ПАСТАЯННЫ ПРЫЯРЫТЭТ

— Аляксандр Уладзіміравіч, дашкольная адукацыя — важны складнік сацыяльнага жыцця краіны. Як вы сёння ацэньваеце яе якасць і ад чаго, па-вашаму, залежыць гэты паказчык?

— Якасць адукацыі на ўсіх узроўнях, у тым ліку дашкольнай, — пастаянны прыярытэт нашай галіны. Ацэнку ёй даў кіраўнік дзяржавы яшчэ ў 2017 годзе на Рэспубліканскім педагагічным савеце: «Беларуская дашкольная адукацыя не мае аналагаў у свеце. Наша дашкольная адукацыя найлепшая ў свеце». Пагадзіцеся, гэта найвышэйшая ступень прызнання дзейнасці ўсёй сістэмы дашкольнай адукацыі Беларусі. Хачу падкрэсліць, што яе якасць складаецца не толькі з навучальных праграм, вучэбных выданняў і адукацыйных паслуг, якія аказваюцца ўстановамі дашкольнай адукацыі. Галоўны крытэрый ацэнкі — гэта прафесійная кампетэнтнасць педагогаў, паўнавартаснае кадравае забеспячэнне. І тут у нас дастатковая высокія паказчыкі. Доля педагагічных работнікаў з вышэйшай адукацыяй дасягнула 66,3 працэнта, з адукацыяй па кірунку «Педагогіка дзяцінства» — 57,2 працэнта, з вышэйшай і першай кваліфікацыйнымі катэгорыямі — ужо 60,9 працэнта. Высокія паказчыкі ў нас і па ахопе дашкольнай адукацыяй дзяцей ва ўзросце ад 1 года да 6 гадоў — 88,9 працэнта. Усе дзеці пяцігадовага ўзросту праходзяць падрыхтоўку да навучання на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Спецыялістамі было праведзена сацыялагічнае даследаванне па якасці дашкольнай адукацыі, у якім бралі ўдзел як педагогі, так і бацькі. Яго вынікі — 85 працэнтаў станоўчых адзнак. І гэта сведчыць аб высокай комплекснай ацэнцы якасці дашкольнай адукацыі.

ЛАТО, ПЯТНАШКІ, ВЫБІВАЛЫ...

— Фарміраванне асобы дзіцяці, на думку спецыялістаў, адбываецца да пяці гадоў. Жывыя зносіны сёння нават у самых малых замяняюцца гаджэтамі. Тое самае адбываецца і з кантактнымі гульнямі. На вашу думку, хто і што можа калі не пераламаць сітуацыю, то задаць ёй патрэбны кірунак?

— Сапраўды, у дашкольным узросце закладваюцца асновы фарміравання асобы ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі.

Большую частку часу дзеці ранняга і дашкольнага ўзросту, якія ўжо атрымліваюць дашкольную адукацыю, праводзяць у дашкольных установах адукацыі. Іх развіццё — фізічнае, сацыяльна-маральнае і асобаснае, пазнавальнае, маўленчае і эстэтычнае — адбываецца ў розных відах дзейнасці: пазнавальнай практычнай, гульнявой, працоўнай, мастацкай і, вядома ж, у зносінах. Жывыя зносіны дзіця мае з усімі, хто акружае яго на працягу дня: аднагодкамі, выхавацелем, музычным кіраўніком, кіраўніком фізічнага выхавання і іншымі. Такімі ж жывымі зносінамі напоўнены і розныя формы арганізацыі адукацыйнага працэсу: гульні, заняткі, гульнявыя (адукацыйныя) сітуацыі, назіранні і экскурсіі і іншае. Усё гэта ў дзяцей ёсць, і, паверце, па іх адчуваннях, настроі ўсё гэта не можа замяніць ні адзін гаджэт.

Тое ж датычыцца гульні. У вучэбна-выхаваўчым працэсе дзіцячых садкоў з улікам узроставых асаблівасцяў дзяцей выкарыстоўваецца найбольш шырокі спектр гульняў: сюжэтна-ролевыя, дзеянняў, дыдактычныя, гульні-драматызацыі і іншыя. Усе яны і жывыя, і кантактныя, а ў комплексе спрыяюць рознабаковаму развіццю не толькі асобна ўзятага дзіцяці, але і дзіцячага грамадства ў цэлым.

Бацькі выхаванцаў, дарэчы, з жывым інтарэсам і задавальненнем уключаюцца ў такія гульні, калі ў дзіцячых садках праводзяцца сумесныя — для дзяцей і дарослых — мерапрыемствы.

Шкада, што сёння забытыя і ва ўмовах сямейнага выхавання ўсё менш выкарыс-

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

тоўваюцца настольныя гульні, такія як лато, даміно, іншыя. У нябыт сыходзяць і так званыя дваровыя гульні: скакалкі, класікі, хованкі, выбівалы, пятнашкі... На шчасце, зусім забыць іх не даюць выхавальнікі ў садках. Вось яшчэ адна перавага ўстаноў дашкольнай адукацыі — там у гэтыя і многія іншыя гульні з нашага дзяцінства малыя і сёння могуць пагуляць са сваімі аднагодкамі і педагогамі.

ГАДЖЭТЫ? ПА РЭГЛАМЕНЦЕ!

— Як пераламаць сітуацыю з павальным захапленнем дзецьмі тэлефонамі, планшэтамі і іншымі сучаснымі прыладамі?

— Перакананы, трэба працаваць з бацькамі. Менавіта яны павінны больш аддаваць часу зносінам са сваім дзіцем, гуляць з ім, прывучыць такім чынам да думкі, што гульні, размовы, карысныя заняткі з мамай ці татам не заменіць ні тэлефон, ні камп'ютар, ні тэлевізар.

Што да ўстаноў адукацыі, то тут усё рэгламентавана.

— Калі можна, пра гэта падрабязней.

— Возьмем, напрыклад, персанальныя электронна-вылічальныя машыны (ПЭВМ) і відэадысплейныя тэрміналы (ВДТ). Карыстанне імі дзецьмі дапускаецца з пяці гадоў. А ва ўзросце ад 5 да 6 гадоў забараняецца выкарыстанне партатыўных ПЭВМ і ВДТ. Гэта рэгламентуе спецыяльны дакумент — спецыфічныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні да зместу і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2019 г. № 525. Ёсць яшчэ адзін дакумент — «Патрабаванні пры рабоце з відэадысплейнымі тэрміналамі і электронна-вылічальнымі машынамі», зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2013 г. № 59, які вылучае для педагогаў і юных карыстальнікаў гаджэтамі цэлы шэраг патрабаванняў. Дашкаляты 5-6 гадоў не могуць карыстацца партатыўнымі ПЭВМ — нэтбукамі, ноўтбукамі, а таксама планшэтамі, электроннымі кнігамі і іншымі. Згодна з дакументам, заняткі праводзяцца не больш за два разы на тыдзень, а працягласць бесперапыннага занятку, звязанага з фіксацыяй позірку непасрэдна на экране відэаманітора ПЭВМ, павінна складаць не больш за 10 хвілін. Не дапускаецца адначасовае выкарыстанне аднаго ПЭВМ для дваіх і больш дзяцей. Абавязкова гульнявыя заняткі праводзяцца ў прысутнасці педагагічнага работніка. А вось выкарыстанне камп'ютарных гульняў з напружаным тэмпам і жорсткім зместам і зусім забаронена.

ТОЛЬКІ РАЗАМ

— «Экранная залежнасць» дашкалят нараджае яшчэ адну праблему, пра якую гавораць усё часцей і ўсё з большай трывогай, — нізкую камунікатыўнасць дзяцей.

— Мяркую, калі бацькі будуць прытрымлівацца правіл, аб якіх мы казалі вышэй, і дома пры выкарыстанні гаджэтаў, калі яны будуць захапляць сваіх дзяцей чымсьці цікавым, захапляльным у працэсе зносін з імі, аб «экраннай залежнасці» не трэба будзе турбавацца.

У гэтай справе галоўнымі памочнікамі бацькам павінны стаць педагогі. Менавіта за імі стаіць такая важная частка работы, як інфармацыйна-асветніцкая. Сучасных бацькоў таксама трэба вучыць: як гуляць з дзецьмі, у што гуляць і гэтак далей. Ёсць у гэтай справе яшчэ адны вельмі добрыя памочнікі — навучальныя і навучальна-наглядныя выданні для ўстаноў дашкольнай адукацыі. Дапаможнікі складзены такім чынам, што многія з іх можна выкарыстоўваць не толькі ў дзіцячым садку, але і дома, ва ўмовах сямейнага выхавання. Я нават назаву некаторыя з іх: вучэбна-метадычны комплекс «Мае першыя ўрокі», серыі «Сцежкі пазнання», «Староннекі роднай зямлі», «Свет дзяцінства», «Жыла-была казка», «Разумней!» і іншыя. Гульні і гульнявыя практыкаванні, адукацыйныя сітуацыі, якія вы там знойдзеце, дапамагаюць не толькі развіваць інтэлект дзіцяці, але і збірацца разам членам сям'і, адчуваць радасць зносін, цікава камунікаваць адно з адным.

ВЫХАВАЛЬНІК, ПЕДАГОГ, ПСІХОЛАГ

— Праблемы, аб якіх мы казалі вышэй, у сучаснай дашкольнай адукацыі далёка не адзіныя. Каб нівеліраваць іх, выхавацелю патрэбны і асаблівыя падыходы, і дадатковыя веды. Як мінімум сучаснай дзіцячай псіхалогіі...

— Так, сапраўды, сёння да выхавацеля нароўні з іншымі кваліфікацыйнымі патрабаваннямі прад'яўляецца і такое, як веданне дзіцячай, узроставай, педагагічнай і сацыяльнай псіхалогіі, а таксама шэраг іншых.

— Які педагог павінен працаваць у сучаснай установе дашкольнай адукацыі?

— У сучаснай установе дашкольнай адукацыі павінен працаваць высокакваліфікаваны спецыяліст, які валодае як базавымі ведамі і навыкамі ў галіне дашкольнай педагогікі і псіхалогіі, методыкамі дашкольнай адукацыі, так і разнастайнымі сучаснымі метадамі і тэхналогіямі арганізацыі адукацыйнага працэсу. У тым ліку камукацыйнымі, з улікам узроставых асаблівасцяў дзяцей і індывідуальных запатрабаванняў у атрыманні адукацыі. Пры гэтым усё роўна, кім ён працуе: выхавацелем дашкольнай адукацыі, музычным кіраўніком, кіраўніком фізічнага выхавання або загадчыкам дзіцячага садка.

Але перш за ўсё гэта павінен быць чалавек, які любіць дзяцей і сваю прафесію, які ўмее знаходзіць падыход да кожнага дзіцяці. Чалавек, які ўмее не толькі вучыць дзяцей, але і сам здольны вучыцца ў іх асоба актыўная і адкрытая ўсяму новаму.

Упэўнены, у прафесію педагога на любым узроўні адукацыі, а тым больш на ўзроўні дашкольнай, неабходна ісці па прызванні. Бо прафесіяналізм, неабыякавасць тых, хто цяпер працуе з дзецьмі, — усё гэта вельмі важна для таго, каб дапамагчы кожнаму малому раскрыць свае здольнасці, найлепшыя чалавечыя якасці, здабыць веды і духоўныя каштоўнасці, зберагчы і прымножыць дасягненні, якімі славіцца наша краіна.

НЕ Ў КАНФЛІКЦЕ, А Ў КАНТАКЦЕ

— Яшчэ адзін важны момант — узаемадзеянне з бацькамі. Педагог дзіцячага садка і бацькі павінны выхоўваць дзіця ў цесным партнёрстве. Гэта ў ідэале. Ці так гэта на самай справе?

— Узаемадзеянне з бацькамі — сапраўды вельмі важны момант, я б нават сказаў неабходная ўмова выхавання шчаслівых і здаровых дзяцей.

Педагогі імкнуцца зрабіць для сваіх выхаванцаў усё, што ад іх залежыць. Пры гэтым не варта забываць, што першачарговая, значная роля ў развіцці дзіцяці, асабліва маленькага, належыць сям'і. Менавіта тут яно праходзіць першую школу чалавечых адносін, засвойвае нормы паводзін, каштоўнасці, культурныя традыцыі сваіх продкаў, свайго народа. У дзіцячы садок прыходзяць дзеці з розных сем'яў. І педагогі вельмі выразна бачаць, што поспехі сямейнага выхавання шмат у чым залежаць ад агульнай культуры бацькоў, іх псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці і досведу.

У працэсе ўзаемадзеяння з сем'ямі ўдасканальваецца педагагічная пазіцыя бацькоў і педагогаў дзіцячага сада, фарміруецца пры гэтым і адзінства ў поглядах на дзіця як на самакаштоўнасць, індывідуальнасць і непаўторнасць, што важна для паўнацэннага развіцця яго асобы, захавання і ўмацавання яго здароўя, у тым ліку псіхалагічнага.

Адной з функцый прафесійнага ўзаемадзеяння спецыялістаў установы дашкольнай адукацыі з сем'ямі выхаванцаў з'яўляецца садзейнічанне ў фарміраванні адказнага пазітыўнага бацькоўства. Супрацоўнічаючы з бацькамі, зацікавіўшы іх сумеснай дзейнасцю ў працэсе гэтага супрацоўніцтва, педагогі таксама маюць магчымасць папоўніць багаж сваіх ведаў і уменняў. А ўдзел бацькоў у розных формах арганізацыі адукацыйнага працэсу сыграе на павышэнне яго якасці і эфектыўнасці, унясе ў яго асаблівы эмацыянальна-пазітыўны зарад і, што самае галоўнае, узмоцніць прыцягальнасць гэтага працэсу для дзяцей.

Такога роду супрацоўніцтва спрыяе яднанню педагагічнага і бацькоўскага калектываў, нараджае ў іх пачуццё «мы», пачуццё прыналежнасці да адной каманды.

— Ці ёсць прыклады такога эфектыўнага супрацоўніцтва?

— Колькі заўгодна. Напрыклад, дзейнасць сямейнага клуба «Спадчына» ў дзіцячым садку № 76 г. Мінска, дзе ідзе фарміраванне ў дашкалят грамадзянскасці і патрыятызму. У Наваполацкім дзіцячым садку № 3 штогод праводзіцца фестываль сямейнай творчасці «Тэатральная вясна». На працягу сямі гадоў рэалізоўваецца праект «Здаровы дзіцячы садок» у ДУА «Дзіцячы садок № 4 г. Ганцавічы». Работа па фарміраванні адказнай бацькоўскай пазіцыі вядзецца ва ўстанове адукацыі «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці г. п. Дзітва» Лідскага раёна. І такіх адрасоў карыснага досведу можна назваць яшчэ вельмі шмат.

НАВУЧАЮЧЫ — ВЫХОЎВАЦЬ

— Якія задачы ставяцца сёння ў прыярытэт: выхоўваць ці навучаць, падрыхтоўваючы дзіця да школы?

— Яшчэ вялікі класік Леў Талстой казаў пра тое, што «і выхаванне, і адукацыя непадзельныя — нельга выхоўваць, не перадаючы веды, усякія ж веды выхаваўчыя». І сёння гэтая думка актуальная як ніколі.

Пачынаючы з дзіцячага садка, акрамя перадачы ведаў, у выхаванцаў фарміруюць уяўленні аб свеце і родным краі, навыкі камунікацыі і ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі (аднагодкамі, дарослымі), выхоўваюць маральнасць, патрыятычныя пачуцці, працавітасць, далучаюць да агульначалавечых каштоўнасцяў, нацыянальных культурных традыцый. Напрыклад, усталёўваючы вызначаныя заканамернасці ў навакольным прыродным і рукатворным свеце, дзіця разумее, што ставіцца да яго трэба беражліва і адказна.

Пры гэтым выхаванне і духоўнае фарміраванне асобы з'яўляюцца неад'емнай часткай адукацыйнага працэсу. Выхаванне накіравана на развіццё такіх асобасных якасцяў, як дысцыпліна, павага да іншых, талерантнасць і маральнасць.

І педагогі, і бацькі не толькі навучаюць сваіх дзяцей, але і перадаюць ім маральныя прынцыпы і каштоўнасці. Напрыклад, падкормліваючы зімой птушак, дзіця не толькі праяўляе пра іх клопат, але і вучыцца розным спосабам догляду, запамінае віды птушак, іх назвы і адметныя прыкметы. Пры арганізацыі працоўнай дзейнасці на ўчастку дзіцячага садка або на дачным участку дарослыя выхоўваюць у дзяцей не толькі працавітасць, фарміруюць у «жывых зносінах» уменне сумесна з дарослымі і аднагодкамі дагледаць расліны, але і замацоўваюць навыкі падліку, арыентавання ў прасторы і іншае.

Дарослыя, праводзячы час з дзецьмі, фарміруюць у іх эмацыянальную сувязь, вучаць іх дабрыні і спагадзе. Такое выхаванне садзейнічае развіццю сацыяльнай адаптацыі і фарміраванню пазітыўнага стаўлення да навакольнага свету.

Такім чынам, прытрымліваючыся формулы «навучаючы — выхоўваць, выхоўваючы — навучаць», педагог можа не толькі падрыхтаваць дзіця дашкольнага ўзросту да наступнай прыступкі адукацыі — школы, але і выхаваць гарманічную, цэласную асобу.

Гутарыла Алена ВІНАГРАДАВА.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельремстрой» (продавец) извещает о проведении 16 октября 2024 года открытого повторного аукциона с понижением цены на 50 % по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2-9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи с НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка с НДС (20 %), бел. руб.
1	**Автомобиль легковой VAZ-21713**, универсал, регистрационный знак 4054 ЕС-3, инв. № 0580, VIN ХТА217130D0105885, год выпуска 2013 г., пробег 282793 км, тип двигателя – бензин, объем – 1,6 л, цвет – черный, МКПП, находящийся по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 6. Автомобиль находится в удовлетворительном состоянии	3 840,00	384,00

Продавец: ОАО «Гомельремстрой» , г. Гомель, ул. Шилова, 6.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (029) 619-58-79 Афанаськов Григорий Григорьевич, для заключения договора купли-продажи: 8 (044) 745-58-84 Халилова Мая Григорьевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельремстрой»):** р/с BY25 BAPB 3012 0490 0839 2400 1001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Гомель, БИК BAPBBY2X, УНП 490083924, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 07 октября 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 14 октября 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5 %** (далее – Претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5(пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности».

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.07.2024 г. № 144 (30278).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальных сайтах Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

Организатор аукциона – **РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала,** расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

Лот 1: помещение на 2-м этаже в капитальном строении, здании АТС-47, площадью 477,5 кв. м, по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:

1.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 477,5 = 119,375 БАВ.

Лот 2: помещение на 2-м этаже в капитальном строении, здании АТС-47 площадью 17,9 кв. м, по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:

2.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1БАВ * 0,25 * 17,9 = 4,475 БАВ.

Лот 3: помещение на 2-м этаже в капитальном строении, здании АТС-47 площадью 16,8 кв. м, по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:

3.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1БАВ * 0,25 * 16,8 = 4,2 БАВ.

Лот 4: помещения на 2-м этаже в капитальном строении, здании АТС-47 площадью 11,3 кв. м, по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:

4.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 11,3 = 2,825 БАВ.

Лот 5: помещение на 2-м этаже в капитальном строении, здании АТС-47 площадью 16,8 кв. м, по пер. 1-й Торфяной, д. 6В в г. Барановичи Брестской области:

5.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 16,8 = 4,2 БАВ.

Лот 6: помещения со вспомогательной площадью на 1-м этаже в капитальном строении, здании подстанции площадью 78,4 кв. м, по ул. Энтузиастов, д. 66А в г. Барановичи Брестской области:

6.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 78,4 = 19,6 БАВ.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п.7.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 16.05.2023 № 138; коэффициент – 3,0, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Аукцион состоится 29 октября 2024 года в 14.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

Документы на участие в аукционе принимаются **с 07 октября 2024 года по 28 октября 2024 года** в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416.

Для участия в аукционе участник аукциона, в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB 30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC)-AKBBBY2X, УНП 201003265.
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей:

- подписания протокола о результатах аукциона;
- оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды;
- возмещения затрат на организацию и проведение аукциона;
- заключения договора аренды – **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан несостоявшимся, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машиномест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Телефон для справок: (8-0162) 22-10-20, тел./факс 22-15-42.

Информация о проведении **24 октября 2024 года в 15.00** повторных аукционных торгов по продаже имущества, принадлежащего РУП «Торговый дом «Восточный»

Сведения о предмете торгов (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708179937, общей площадью 2878,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, тр-т Игуменский, 16-388 (наименование и назначение – торговое помещение), и установленные в нем системы и оборудование: система пожарной сигнализации и оповещения о пожаре с инвентарным номером 2748, система водяного пожаротушения и система автоматизации с инвентарным номером 2749, система охранной сигнализации с инвентарным номером 2751, система контроля доступа с инвентарным номером 2753, система холодоснабжения с инвентарным номером 2756

Начальная цена – 8 179 347,14 бел. руб. с учетом НДС	**Размер задатка** – 817 934,71 бел. руб.

Продавец имущества – РУП «Торговый дом «Восточный», 220125, г. Минск, ул. Уручская, 14А, тел. +375 (17) 275 75 23.
Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел.: +375 (17) 365 48 36

Срок и место приема заявлений: по 22.10.2024 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок оформления участия в торгах и проведения аукциона изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»). **Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Горбовщина, д. 7, имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 7х9 м.
Площадь: 63 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1956 г.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Апимахович Анна Емельяновна, умерла 09.09.2004 г. Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет уведомлений не поступало о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо место нахождения, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область.**

Электронный адрес: **kraysk@logoysk.gov.by.**

Телефоны для справок: **80177473636, 73635.**

УНП 600181643

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

КРАЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Логойского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Логойский район, Крайский сельсовет, д. Малые Нестановичи, ул. Колхозная д. б/н, имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме

Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 6 х 9 м.
Площадь: 50 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1957 г.
Материал стен: дерево.
Этажность: одноэтажный.
Подземная этажность: отсутствует.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Навойчик Мария Иосифовна, умерла 13.03.1989 г. Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 3 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Крайский сельский исполнительный комитет уведомлений не поступало о намерении использовать дом для проживания.

Крайский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения в связи с тем, что правообладатели неизвестны или неизвестно место их фактического проживания либо место нахождения, уведомить Крайский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Наш адрес: **223138, аг. Крайск, ул. Буденного, 8, Логойский район, Минская область.**

Электронный адрес: **kraysk@logoysk.gov.by**

Телефоны для справок: **80177473636, 73635.**

УНП 600181643

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности **Минской области и принадлежащего Государственному предприятию «УКС Вилейского района»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения

Аукцион состоится **22.10.2024 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1:

легковой седан CHEVROLET LACETTI, кузов (рама) KL1NF19BJ8K913152.

Начальная цена с НДС 20 % – 7 020,00 руб.

Место нахождения: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 89.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ЕВРАЗИЯ.DOC
фестиваль документального кино стран СНГ

АЎТАРСКІ ПОГЛЯД НА ЧАЛАВЕКА І ЯГО ЛЁС

Дакументальнае кіно — люстэрка рэчаіснасці. І ў залежнасці ад таленту стваральнікаў яно аказвае ўплыў на гледача, на яго душу і высновы пра важныя рэчы. І ў тым маглі пераканацца ўдзельнікі і наведвальнікі VIII Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC», які 3 і 4 кастрычніка прымала беларуская сталіца. Разнастайнасць тэм, аўтарскіх падыходаў у іх раскрыцці дазволіла гледачам не толькі даведацца гісторыі асобных герояў у кантэксце часу і абставін, але і задаць самім сабе шэраг важных пытанняў.

Напярэдадні кінапаказаў і мерапрыемстваў у Мінску прайшла прэс-канферэнцыя з журы і дырэкцыяй кінафоруму. Дарослая праграма, у якую сёлета з 324 заявак з 16 краін свету трапіла 32 кінаработы, прайшла восьмы раз, а Маладзёжны конкурс «Еўразія.DOC: 4 хвіліны» стаў сёлета сёмым. З 30 верасня тры дні фестываль актыўна адпрацаваў у Смаленску. Там прайшло адкрыццё кінафоруму, шэраг круглых сталоў, прэзентацыі новых мультымедыйных праектаў, а таксама адкрытыя паказы дакументальных кінастужак, якія знайшлі жывы водгук у смаленскай аўдыторыі.

— Адбор дазваляе нам спрэсаваць вялікую колькасць фільмаў да кароткай праграмы. І, па меркаванні і па ацэнках усіх, хто бачыў фільмы, наш фестываль сёлета зрабіў яшчэ адзін крок: выросла якасць фільмаў. Заўважылі нашы калегі і такую акалічнасць, што памаладзеў склад аўтараў. Але яны робяць вельмі цікавае, сур'ёзнае, якаснае кіно, — адзначыў **дырэктар некамерцыйнага VIII Міжнароднага фестывалю дакументальнага кіно краін СНД «Еўразія.DOC» Валерый ШАХАЎЦОЎ**. — Геаграфію мы таксама пашыраем. Сёлета ў нас на фестывалі прысутнічаюць калегі з Кітая і Ірана. І ў Смаленску з году ў год мы адчуваем жывы інтарэс да фестывалю. Ён расце, на яго мерапрыемствы і на паказы фільмаў прыходзяць людзі. Прычым такое ўражанне, быццам у нас сфарміравалася свая аўдыторыя. Мы вельмі гэтаму радуемся і працягваем працаваць у гэтым кірунку.

У Мінску гледачам таксама прадставілі шмат цікавых дакументальных кінастужак. Адметна, што тры з прэзентаваных фільмаў беларускіх аўтараў закраналі тэму Вялікай Айчыннай вайны, яе наступстваў. Думаю, не памылюся, калі скажу, што такія работы якраз дапамагаюць захоўваць памяць пра трагічныя падзеі мінулага і даюць разуменне сучаснікам, як важна, каб не паўтарылася падобнае. «Яна — вайна» Паліны Лушчык, «Мінск 1944. Вызваленне» Аксаны Лашкевіч і «Шталаг 352. Без права на забыццё» Аляксандра Шурмілёва — кіно менавіта гэтага кірунку. А вось кінаработа Ганны Літаш «Горад пад намі» — гісторыя пра сучасных герояў, лётчыкаў Андрэя Нічыпорчыка і лейтэнанта Мікіту Куканенку, якія сталі пасмяротна Героямі Беларусі. У маі 2021 года пры выкананні трэніровачнага палёту іх экіпаж знайшоў тэхнічную няспраўнасць самалёта, і, каб пазбегнуць чалавечых ахвяр, лётчыкі праявілі мужнасць і адвялі самалёт ад жылых дамоў, але, на жаль, загінулі самі... У фільме іх блізкія сябры, калегі дзеляцца ўспамінамі пра той дзень...

— Гэтая трагедыя адбылася 19 мая 2021 года. І да гадавіны іх смерці мы знялі дакументальны фільм. Ён паказвае лёс маладых афіцэраў, але мы хацелі паказаць іх не толькі прафесіяналамі, але і бацькамі, мужамі, сынамі. Таму ў кадры так шмат асабістага. Было складана працаваць з іх блізкімі людзьмі, таму што гора ніколі не змяншаецца пасля страты нават з часам, — дзеліцца Ганна Літаш. — І калі судакранаешся з такой гісторыяй, то ўсведамляеш, якой душы і прафесіяналізму былі гэтыя людзі. Хочацца, каб як мага больш людзей даведваліся пра нашых герояў. Месца подзвігу

ёсць заўсёды, але ты не бачыш яго штодня. Ты працуеш з людзьмі і можаш нават не ведаць, на што кожны з нас здольны. Вядома, для мяне асабіста нашы героі — прыклад смеласці, адвагі, узор сапраўдных афіцэраў. І, думаю, кожны пасля прагляду ўсвядоміць, якое крохкае наша жыццё, як важна цаніць кожную хвіліну, жыць тут і цяпер і пры гэтым рабіць якасна сваю справу...

— У Смаленску мне пашчасціла мадэрыраваць адкрытую дыскусію беларускай кінастужкі «Гаспар на сувязь не выйшаў» Анатоля Занковіча, дзе арыгінальны жанр, дзе спалучаны дакументалістыка, спецыяльны рэпартаж, трылер. І раблю выснову, што тэма бяспекі, вайны і міру, тэма чалавека ў зменлівым свеце, тэма малой радзімы хвалююць аднолькава ўсіх, — адзначыў **выканаўчы дырэктар фестывалю, старшыня праўлення ГА «Беларускі саюз журналістаў» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ**. — І падчас размовы пытанні былі досыць прадметныя, якія адсылалі нас да трагедый у тым ліку сённяшняга дня: бяспека ў інтэрнэце, выкарыстанне тэрарыстычных метадаў у супрацьстаянні цэлых дзяржаў і блокаў, а яшчэ чалавек, які абірае служэнне Радзіме і здзяйсняе подзвіг альбо дзякуючы свайму ўнутранаму чалавечаму росту робіць жыццё вакол больш камфортным і больш адкрытым для іншых. Сацыяльная тэма на нашым фестывалі вельмі сур'ёзна гучыць і атрымала самае сур'ёзнае распаўсюджанне. І мы можам яе зразумець і адчуць.

Як прыклад, згадаць хочацца некалькі фільмаў. Адзін з іх — «Мама» рэжысёра Айдана Асан Кызы з Кыргызстана. У кадры — шматдзетная маці, яе будні на рабоце і ў коле сваіх дзяцей. Цяжкае жыццё адчуваецца ва ўсім: у працы, дзе жанчына (яна медсястра) дапамагае акрыяць дзеткам, у тым, калі яна выходзіць за ганак бальніцы і ідзе ў краму па самае неабходнае, і ўрэшце ва ўмовах жыцця гэтай сям'і. Але ў фільме ёсць вельмі шмат надзеі, бо старэйшыя дзеці клапоцяцца пра малодшых, у іх ёсць маці, якая клапоціцца як можа. Пытанне, праўда, дзе бацька сямейства? Прычым шмат там і іншых праблем агучана, і ёсць падставы задумацца не толькі пра сам выбар гераіняй такога існавання, але і ўвогуле пра тое, ці клапоцяцца там пра чалавека, чым жывуць тыя, хто знаходзіцца побач з гэтай сям'ёй? І якраз эпізод, калі ў фінале гучыць казка пра хлопчыка, які вырас і назбіраў шмат зор для зямлі, і дае падставу думаць, што, можа, і гэтыя дзеці, стаўшы дарослымі, памножаць добрае ў нашым свеце, зменяць да лепшага жыццё сваёй мамы...

Кінастужка «Дом майго дзядулі» — гісторыя азербайджанскага рэжысёра Лэйлыханым Ганбарлі, якая вяртаецца ў дом свайго дзеда дзеля пошуку важных для сябе адказаў. Кранальная гісторыя, дзе на месца спустошанасці прыходзіць сэнс вяртання ў родны дом, да вытокаў, у дэкарацыях якіх прайшло жыццё некалькіх пакаленняў сям'і. Міжволі хочацца пасля прагляду лішні раз патэлефанаваць блізкім, а лепш з'ездзіць у тыя мясціны, якія так шмат ведаюць і помняць пра нас.

А вось фільм «Вы чые, старыя?» рэжысёраў Шэрзода Назарава і Адхамжона Абдурахманава — непаўторны аповед пра любоў да жыцця незалежна ад узросту. Стваральнікам кінастужкі ўдалося, лічу, паказаць гледачам сапраўдны і непаўторны гімн людзям, якія ва ўсім і ў сабе найперш захоўваюць любоў, веру, аптымізм. Назіраючы за вандроўкай двух сівароў у паважаным узросце, глядач мае магчымасць не толькі падзяляць з героямі іх прыгоду, але і ўсведамляць, наколькі свет вакол кожнага з нас непаўторны і шчодры. Так, вельмі кранальна назіраць, калі за рамонт кола майстар не бярэ грошай, а просіць проста памаліцца за яго. Такія моманты сапраўды вяртаюць веру ў штосьці вялікае, бязмежнае і сапраўднае, на чым трымаецца свет.

— Як прадстаўнік журы, хачу падзякаваць, што фестываль «Еўразія.DOC» працягвае жыць. Вельмі моцныя і адметныя работы сёлета спаборнічаюць паміж сабой. Слушна тут адзначылі, што памаладзелі тыя, хто стварае гэтае дакументальнае кіно. Маладыя людзі прыходзяць у дакументалістыку і робяць цудоўнае кіно. Мяне ўразіла, наколькі моладзь уцягнута ў глабальныя праблемы, таму што любы фільм разглядае вечныя каштоўнасці і праблемы, — падзялілася **старшыня Беларускага саюза жанчын, дырэктар МТРК «Мір» у Рэспубліцы Беларусь, член журы фестывалю «Еўразія.DOC» Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ**. — Сярод тэм, што непакоіць нашу моладзь, — і Вялікая Айчынная вайна, і СВА — незалежна ад назвы, гэта ваенныя дзеянні, якія вядуць да гібелі людзей, дзяцей. Калі такія тэмы хвалююць, то, відаць, мы правільныя каштоўнасці закладаем у падрастаючае пакаленне. Ці ўзяць фільмы, у якіх падымаецца тэма гісторыі малой радзімы, вяртання на малую радзіму, адраджэння вёсак. Гэта таксама глабальныя каштоўнасці, якія павінны быць закладзены ў кожным. Усе фільмы розныя і па выкананні, і па якасці, але ў кожным — глыбокі сэнс, ёсць перажыванні аўтара. У кожны ўкладзена душа яго стваральніка, глыбокае бачанне і перажыванне абранай гісторыі.

Сапраўды, сёлетняя праграма фестывалю паказала шмат свежых і нестандартных аўтарскіх поглядаў на надзённыя, актуальныя і вечныя тэмы. На пляцоўках адкрытых паказаў прысутнічалі аўтары і праваўласнікі фільмаў, што дало магчымасць прадзюсарам дамаўляцца аб далейшых паказах упадабаных кінастужак на каналах, у кінатэатрах. Як падзяліліся арганізатары фестывалю, кінастужкі «Еўразіі.DOC», напрыклад, будуць мець постфестывальнае жыццё ў Мінскай вобласці. І, падсумоўваючы ўласныя ўражанні, бо вынікі на момант напісання матэрыялу яшчэ не вядомы, хочацца сказаць пра тое, як добра, што такія кінафорумы існуюць, і парадавацца за ўсіх тых, хто спрычыніўся сёлета да мастацтва дакументальнага кіно і каго сустрэча з ім яшчэ чакае.

Алена ДРАПКО.

Сёлетняя праграма фестывалю паказала шмат свежых і нестандартных аўтарскіх поглядаў на надзённыя, актуальныя і вечныя тэмы. На пляцоўках адкрытых паказаў прысутнічалі аўтары і праваўласнікі фільмаў, што дало магчымасць прадзюсарам дамаўляцца аб далейшых паказах упадабаных кінастужак на каналах, у кінатэатрах. Як падзяліліся арганізатары фестывалю, кінастужкі «Еўразіі.DOC», напрыклад, будуць мець постфестывальнае жыццё ў Мінскай вобласці. І, падсумоўваючы ўласныя ўражанні, бо вынікі на момант напісання матэрыялу яшчэ не вядомы, хочацца сказаць пра тое, як добра, што такія кінафорумы існуюць, і парадавацца за ўсіх тых, хто спрычыніўся сёлета да мастацтва дакументальнага кіно і каго сустрэча з ім яшчэ чакае.

Андрэй БАРБАШЫНСКІ:

«Калі мы гаворым пра медалі для краіны, без вучылішча алімпійскага рэзерву не абысціся»

Сцены Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву бачылі і памятаюць многае. Тут хавалася пад коўдрай, каб крыху адпачыць паміж трэніроўкамі, юная Антаніна Кошаль, алімпійская чэмпіёнка 1972 года. Гэтыя сцены памятаюць яшчэ зусім незоркавых Кацярыну Карстэн і Віталя Шчэрбу. На базе вучылішча свае першыя крокі ў лёгкай атлетыцы зрабіла белая маланка Юлія Несцярэнка. У перабудову будучыя алімпійскія чэмпіёны па гандболе Андрэй Барбашынскі і Андрэй Мінеўскі былі фізічна падрыхтаваны настолькі, што пасля працоўнага тыдня ў суботу ўцякалі разгружаць вагоны, каб хоць нешта зарабіць. За гучнымі перамогамі, сусветнымі рэкордамі і бліскучымі кар'ерамі выпускніковў унёсак вучылішча алімпійскага рэзерву часта страчваецца. Сёння ў камфортных умовах пад кіраўніцтвам таленавітых трэнераў тут набірае сілу новае пакаленне спартсменаў. З гэтага года адказнасць за іх светлую спартыўную будучыню ляжыць на плячах Андрэя Барбашынскага. На шчасце, сёння навучэнцам вучылішча алімпійскага рэзерву не трэба па суботах разгружаць вагоны, каб зарабіць кішэнных грошай і палепшыць побыт, — у іх ёсць усё і нават больш. Але пытанняў і праблем, якія стаяць перад кіраўніцтвам, нямала. З якім настроем Андрэй Барбашынскі вярнуўся ў роднае вучылішча і якія ў яго планы на новую старонку ў жыцці, ён распавёў «Звяздзе».

Фота прэс-службы РДВАР.

— Андрэй Станіслававіч, маглі калі-небудзь уявіць, што ўзначаліце Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву, сваю альма-матар?

— Калі папраўдзе, то ніколі не ўяўляў сябе ў гэтай ролі. У мяне была насычаная спартыўная кар'ера, пасля спорту я займаўся бізнесам, грамадскай дзейнасцю, па меры магчымасцяў дапамагаў спорту, у мяне гэта нядрэнна атрымлівалася. Але лёс даў магчымасць дапамагаць развіццю спорту ў іншай ролі. Прапанова ўзначаліць вучылішча было нечаканай. Думаў я нядоўга. Лічу, што найважнейшыя рашэнні трэба прымаць сэрцам: яно лепш ведае. Так пачалася новая старонка ў маім жыцці. Разумею, што проста не будзе. Установа складаная — вялікі калектыў, трэба адказваць і за харчаванне, і за вучобу, і за спартыўную падрыхтоўку, і за пражыванне сотняў дзяцей. Але чым складаней — тым цікавей. Мы, алімпійцы, цяжкасцяў не баімся. Бо проста так нікому нічога не даецца ні ў спорце, ні ў жыцці. Ёсць мэты і задачы, і трэба іх выконваць, імкнуцца рабіць кожны дзень лепшым за папярэдні.

— Сучасная моладзь — аўдыторыя няпростая...

— Ды і я не такі ўжо і старажытны, каб не разумець гэту моладзь. У мяне два сыны, яны мяне вучаць сучаснаму жыццю. Я гатовы да таго, што калі-небудзь адзін з іх прыйдзе і скажа: «Тат, ты зусім не арыентуешся ў тым, што адбываецца, і жывеш у іншым свеце». Пакуль гэтага не прагучала, бо я стараюся быць з імі на адной хвалі, разам рухацца, разам вывучаць свет і разам прымаць рашэнні. Мне падабаецца размаўляць з моладдзю, я атрымліваю ад гэтага задавальненне. Але я папярэдзіў дзяцей ды і трэнераў з выкладчыкамі, што да двух лічыць не буду. Усе ў роўных умовах, ва ўсіх ёсць шанц праявіць сябе — калі ласка, дзейнічайце.

— Напэўна, складанасці дадае і тое, што для сотняў рабят, якія прыехалі з іншых гарадоў, вы цяпер і за «бацьку». Адчулі ўжо ступень адказнасці за дзяцей, якіх вам даверылі бацькі?

Лот № 1: изолированное помещение № 1 здания строительного рынка
с инв. № 600/D-83134, 1379,9 кв. м.

Адрес: **Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, 14/1-1, район аг. Озерцо.**

Обременения – аренда.

Начальная цена с НДС 20 % – 2 115 600,00 руб.
Задаток – 50 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – gostorg.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – **06.11.2024 в 11.00.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9.
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот № 1:
1) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22070 (наименование: проходная мех. двора, инв. № 018; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 46,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га, составные части и принадлежности: ограждение; 2) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22069 (наименование: гаражи, инв. № 016; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 1014,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А/1, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га; 3) капитальное строение с инвентарным номером 150/С-22062 (наименование: склад материальный, инв. № 019; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 1007,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 4А/2, западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000141, площадью 2,4454 га

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	64 368,00	Размер задатка, руб.	6 436,80

Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 150/С-23295 (наименование: столовая, инв. № 330; назначение: здание специализированное иного назначения), площадью 334,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Городокский с/с, 14, 0,2 км западнее аг. Кожан-Городок, на земельном участке с кадастровым номером 124781700001000151, площадью 0,1967 га, составные части и принадлежности: 1 – Уборная н.ч., а – Скважина, б – Септик, в – Ограждение, г – Дворовое покрытие, (1) – Уборная п.ч.

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	31 824,00	Размер задатка, руб.	3 182,40

Лот № 3: капитальное строение с инвентарным номером 150/С-23271 (наименование: Колбасный цех, инв. № 286; назначение: Здание специализированное иного назначения), площадью 872,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 31, 0,09 км севернее аг. Дворец, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001450, площадью 0,6467 га, составные части и принадлежности: 1 – Пристройка, 2 – Пристройка, 3 – Навес, 4 – Проходная, 5 – Весовая, 6 – Уборная н.ч., 7 – Навес для соли, 8 – Склад для топлива, 9 – Склад для топлива, а – Благоустройство территории, б – Дезбарьер, в – Дезбарьер, ж – Дезбарьер, к – Площадка для ТБО, г – Септик, и – Септик, д – База предубойного содержания скота, е – База предубойного содержания скота, м – Ограждение, (6) – Уборная п.ч., л – Ёмкость 3 куб. м

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	182 880,00	Размер задатка, руб.	18 288,00

Продавец: ОАО «Дворецкий», Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Дворец, ул. Школьная, 3, тел./факс 80164793432. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Обременение:** наличие действующего договора аренды

Аукцион состоится 22 октября 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также ее можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 21 октября 2024 г. до 17.00.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества

ООО «Производственная компания Ромакс»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Грузовой фургон MERCEDES-BENZ ATEGO 815, рег. знак АЕ 5432-4, кузов (рама) № WDB9700151L088714, 2005 г. вып.	59 808,00	5 980,80	2 990,40
2	Автомобиль-грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER FT 440, рег. знак АМ 9817-4, кузов (рама) № VF3EZMFC12305803, 2012 г. вып.	32 724,00	3 272,40	1 636,20
3	Автомобиль-грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER, рег. знак АМ 9825-4, кузов (рама) № VF3YEBMFC12023546, 2011 г. вып.	28 188,00	2 818,80	1 409,40

В отношении лота № 1 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 30 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 182 (30316) от 18.09.2024, стр. 15.
В отношении лотов №№ 2, 3 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 165 (30299) от 24.08.2024, стр. 10

В отношении лотов имеется ограничение (обременение) в виде залога. Дополнительная информация по тел. +375295767715 (Юлия)

Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Калиновского, 117

Дата и время проведения торгов	**18 октября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	с 10.00 7 октября 2024 года до 16.00 16 октября 2024 года

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Производственная компания Ромакс», проводимых 18.10.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1 – 6 %, по лотам №№ 2, 3 – 7 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 12 (двенадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ООО «Производственная компания Ромакс» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 576-77-15 (Юлия) (Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Липнишки, ул. Виленская, 12А, комн. 2В, УНП 590718744)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ З РОЛІ МУРАША

Штрыхі да партрэта Барыса Платонава

У фондзе пісьменніка, тэатразнаўцы, акцёра Яўгена Рамановіча, што захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, сабраны напісаныя ў 1950-х аўтабіяграфіі акцёраў і мастакоў тэатра імя Янкі Купалы, колішняга БДТ-1. Цэлае сузор'е імёнаў! Вера Пола, Уладзімір Уладамірскі, Глеб Глебаў, Лідзія Ржэцкая, Леанід Рахленка... Пісалі на самых розных аркушах, рознымі па ступені разборлівасці почыркамі... Хтосьці абмежаваўся адной старонкай, хтосьці напісаў цэлы аўтабіяграфічны артыкул. У тым стосе захоўваюцца два аднолькавыя аркушыкі: ружаватая выцвілая папера, падобная на школьны сшытак. Гэта аўтабіяграфіі двух народных артыстаў — Барыса Платонава і Ірыны Ждановіч. І па стылі гэтыя дакументы падобныя, і почырк адзін... І гэта невыпадкова: Барыс Віктаравіч і Ірына Фларыянаўна не толькі калегі па сцэне, але і сужэнцы, якія шмат гадоў крочылі побач, перажыўшы нямала ўсялякага... У мінулым годзе адзначалася 120-годдзе Барыса Платонава, а сёлета — 30-годдзе з дня смерці Ірыны Ждановіч, якая перажыла мужа амаль на трыццаць гадоў. І пра Барыса Платонава, і пра Ірыну Ждановіч, дачку заснавальніка беларускага тэатра Фларыяна Ждановіча, напісана шмат... Але давайце разам пагартаем дакументы БДАМЛМ, каб успомніць гэтых людзей і, магчыма, даведацца нешта новае.

Па просьбе «глубоко-седого последователя»

Што ж напісана на тых выцвілых аркушыках з фонду Рамановіча?

«Платонов Борис Викторович. Родился в 1903 г. в г. Минске. Учился до 1919 г. Не окончив быв. реальное училище, при наступлении поляков вступил добровольно в ряды Красной армии. В Красной армии находился до 1921 г. Демобилизовался по возвращении в г. Минск и, поработав некоторое время в кружке «Белорусская хатка», в 1922 г. поступил в 1-й Белгосдрамтеатр, в котором непрерывно работаю по сей день...»

Далей цікавае ўдакладненне: *«В годы детства и учебы выступал на сцене данного театра (мне было лет 9-10) в школьном вечере — инсценировке «Стрекоза и муравей» я пел Муравья».*

Значыць, гаворка аб дарэвалюцыйных часах, калі ў будынку, які пасля зойме Купалаўскі тэатр, дзейнічаў Мінскі гарадскі тэатр.

Унізе прыпіска:

«О моей деятельности актерской в кружке самодеятельности — хорошо знает зав. лит. частью театра засл. артист БССР Е. С. Романович».

Гэта значыць, той самы, што і прасіў напісаць аўтабіяграфію.

Аркушык-блізнюк гэтага дакумента ад імя Ірыны Ждановіч паведамляе:

«Родилась в 1906 г. в г. Минске в семье актера. Окончила 4 кл. быв. гимназии. В школьных спектаклях принимала участие, и с 11 лет отец привлекал меня на детские роли в театре. В 14 лет я была зачислена в штат 1-го Белгосдрамтеатра, в котором работаю по сей день. В 1921 г. осенью была послана в студию в Москву и как несовершеннолетняя была на год возвращена в театр — где я работаю сейчас».

І прыпіска, аналагічная прыпісцы пасля аўтабіяграфіі Барыса Платонава: *«О моей творческой деятельности более полно и отчетливо может сказать, если захочет — наш однокашник и глубоко-седой последователь — зав. лит. частью театра — засл. артист БССР Е. С. Романович».*

Так і ўяўляецца, як Барыс Віктаравіч і Ірына Фларыянаўна разам выконваюць просьбу свайго «глубоко-седого» сябра Рамановіча. Барыс Платонаў, падобна, піша тэксты і за сябе, і за жонку, робяцца аднолькавыя прыпіскі — маўляў, чаго сябар пытаецца, калі сам лепей пра іх дзейнасць можа распавесці.

На адваротным баку аркушыкаў — спісы роляў, даты атрымання ўзнагарод. У Барыса Платонава пазначана сярод іншага — *«1939 — выезд у Беласток»*. Гэта значыць, што пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў там у «дэсанце» дзеячаў культуры. *«1941 г. — война»*. За гэтым скупым радком — эвакуацыя, праца ў канцэртных франтавых брыгадах, «Паўлінка» ў Томску...

Пазнакі заканчваюцца 1952-м. І наўскос нехта напісаў буйнымі літарамі: *«Платонаў акцёр, які не ведаў няўдач»*.

Апальны цесць

Ці заўважылі вы, як у аўтабіяграфіі Ірыны Ждановіч сціпла гаворыцца пра яе бацьку — «акцёр». Справа ў тым, што ў 1930-м Фларыян Ждановіч, які быў не проста акцёрам, а першым мастацкім кіраўніком БДТ-1 і нават курыраваў у Наркамаце асветы ўсе тэатры рэспублікі, быў арыштаваны па сфальсіфікаванай справе Саюза вызвалення Беларусі разам з дзясяткамі іншых дзеячаў культуры і навукі. Несправядлівы прысуд, праца на Беламорканале, высылка, калгасна-саўгасны тэатр Валагодскай вобласці... У 1937-м — паўторны арышт, расстрэл. Месца пахавання заснавальніка беларускага тэатра не вядома.

Можна ўявіць, што перажыла сям'я Платонавых, калі цесць і бацька выявіўся «ворагам народа»... Тым болей і брат Фларыяна Ждановіча, цудоўны акцёр, які выступаў пад псеўданімам Антук Крыніца, быў расстраляны, другога брата, дырэктара завода ў Віцебску, арыштавалі. Ірыну Ждановіч тады, у духу часу, змусілі публічна адрачыся ад бацькі. Пляменнік Барыса Платонава Аляксей так гэта апісаў: *«Ей придумали новую казнь: публично отречься от своего отца. На практике такая мера выглядела невероятным кощунством: актрисе, как говорят в таких случаях, «поцелованной богом», обладающей высочайшим талантом, предлагались унизительные условия существования...»*

І вось яшчэ адзін дакумент, ад 5 мая 1958 года:

«Прокурору Белорусской ССР

Народного артиста СССР Платонова Бориса Викторовича, проживающего по ул. К. Маркса, 8, кв.108

Заявление

Я поступил в ныне Академический театр им. Я. Купалы в 1922 г., где работаю непрерывно по сей день.

Тогда же встретился на работе с Флорианом Павловичем Ждановичем. До того, как я женился на его дочери — в 1923 году я уже знал от товарищей по работе, что Флориан Павлович являлся одним из первых организаторов коллектива театра, одним из активных деятелей творческой и общественной деятельности коллектива.

Дальнейшая совместная работа подтверждала это, и я могу сказать, что деятельность Флориана Павловича Ждановича была огромной и преданной по созданию коллектива, который занимает сейчас одно из выдающихся мест в культуре Белорусской Советской Социалистической Республики».

Дакумент відавочна складаўся дзеля рэабілітацыі цесця Барыса Платонава. І ў гэтым жа годзе,11.7.1958-га Вярхоўным судом БССР Фларыян Ждановіч быў рэабілітаваны.

«Вы нам нужны чрезвычайно»

«Меня увлекает величие человеческой мысли и предельная театральная выразительность; меня увлекает образность драматургического материала и конкретность жанра; меня, наконец, увлекает театр в театре, т.е. Художник, а не только декоратор, Композитор спектакля, а не только наемный музыкант, Осветитель спектакля, а не только человек, включающий или выключающий электричество...»

Гэта з ліста Барыса Эрына, які ў 1960-х быў галоўным рэжысёрам тэатра імя Янкі Купалы, сённяшняга нацыянальнага акадэмічнага...

У 1957 г. Барыс Уладзіміравіч, які яшчэ працаваў у Маскве і толькі прыязджаў у Беларусь, на сцэне Купалаўскага тэатра паставіў п'есу Фігейрэдэа «Ліса і вінаград». Галоўную ролю, антычнага паэта Эзопа, выканаў Барыс Платонаў. У 1957 г. на Усесаюзным фестывалі драматычных тэатраў спектакль «Ліса і вінаград» атрымаў дыплом I ступені.

Працытаваны ліст напісаны ў 1958-м, Эрын падрабязна абмяркоўвае з Барысам Платонавым п'есы для наступных сваіх пастановак у Беларусі, раіцца з ім і, безумоўна, бачыць і Барыса

Платонава, і Ірыну Ждановіч у галоўных ролях сваіх спектакляў.

«А себе я желаю — встретиться в Новом году в работе с Ириной Флориановной и с Борисом Викторовичем только совсем в новой ни в чем не похожей на Эзопа работе», — напісаў ён у віншавальнай паштоўцы любімым акцёрам на новы, 1958-ы, год.

Пастановак будзе яшчэ шмат... 9 лістапада 1964 года Эрын піша Платонаву:

«Глубокоуважаемый Борис Викторович! Дорогой мой друг! Сейчас ночь. Все в доме спят. Я разложил свои дела. Думаю, думаю... И вот, что беспокоит меня первостатейно...

Я очень, очень прошу Вас, не отказывайтесь от работы в «Метели». Вы нам нужны чрезвычайно. Я все сделаю для того, чтобы Ваше участие в этой работе оказалось возможным и удобным со всех точек зрения. Но, умоляю Вас не отказывайтесь! Мне сейчас нужна Ваша помощь как никогда. Необходимо сделать лагерь положительных героев весомым, сильным, проникновенным (Платонов, Ржецкая, Молчанов), чтобы достигнуть равновесия, — не в объеме текста, конечно, — с уходящими с дороги нашей жизни (Рахленко, Глебов)... Замысел развивается... и всё больше и больше возрастает жажда работы с Вами. Обнимаю Вас, целую и жду Вашего «да».

«Платонаў, пяцьдзясят не норма, а норма ўсе сто пяцьдзясят»

Паважалі Барыса Платонава і калегі-артысты. Захоўваецца ў БДАМЛМ ліставанне Барыса Платонава з яшчэ адным карыфеем купалаўскай сцэны, Уладзімірам Уладамірскім. Са свайго ўлюбёнага лецішча — «Пасляскай легенды» у Крыжоўцы — Уладамірскі піша:

«Пишу тебе, как близкому другу, вот по какому делу. С 28 марта 1959 г., как ты знаешь, по воле рока я оставил родной театр и ушел на пенсию. Уйти из театра втихаря мне бы не хотелось, да и нельзя этого делать ни мне, ни театру, которому отдано много здоровья, сил и энергии, а также творческого труда. Я бы очень хотел, Борис Викторович, еще раз встретиться с коллективом работников нашего дорогого нам театра, поблагодарить товарищей за их чуткое сердечное ко мне отношение, за их коллективную помощь в совместной творческой работе в течении 35 лет нашего труда и на прощание пожелать славным купаловцам больших успехов и новых творческих побед во славу нашего искусства. Согласен ты с этим, Борис Викторович? Такую встречу можно организовать по возвращении театра в Минск и на общем собрании, которое, я думаю, состоится по окончании гастролей по БССР. Пригласить и меня, но только заранее предупредить — где? Когда, и в какое время. Обращаюсь именно к тебе, дорогой мой друг, Борис Викторович, т. к. знаю, что ни одно дельное мероприятие не обходится без твоего активного участия».

У архіве захоўваецца некалькі паштовак, дасланых Уладамірскім сям'і Платонавых: паштоўкі ён рабіў сам, падклейваў фота адрасатаў у розных ролях, падмалёўваў, нават фларыстыкай аздабляў — так робяць толькі для дарагіх сяброў.

Сябраваў Барыс Платонаў не толькі з калегамі. На святкаванні ягонага пяцідзесяцігоддзя паэт Аркадзь Куляшоў сачыніў для яго верш-экспромт, рукапіс якога таксама захоўваецца ў архіве. Тут абыгрываюцца назвы спектакляў, у якіх іграў Платонаў, і імёны яго герояў:

«Калі не ад імя мільёнаў —
Ад соцень тысяч гледачоў,
Дазвольце,
дарагі Платонаў,
І мне сказаць вам
пару слоў.
Скажу, як тут усе, без лесці,
Скажу не для пустой хвалы:
На месцы Вы
ў «Даходным месцы»,
У «Апошніх» не апошні Вы.
Вам пяцьдзясят,
Вы тут з сябрамі,
Ды сярод нас Вы
не адзін —
Няміра Павел разам з вамі
І сам Заслонаў Канстанцін.
Таму, не для ўрачыстай
формы,
За ўсіх падняць я чарку
рад:
Платонаў, пяцьдзясят
не норма,
А норма
ўсе сто пяцьдзясят».

На аркушыку надпіс, зроблены Барысам Платонавым: «Напісаў А. Куляшоў у дзень майго 50-годдзя».

Ёсць тут і аркушык з вучнёўскага сшытка ў лінейку, на якім тады ж, падчас юбілейнай вечарыны, Барыс Платонаў напісаў свой вершаваны адказ Куляшову, праўда, гучыць ён трохі сумна:

«В мой юбилей
50-летний
Поэтом выдан был
мандат:
Платонов 50 не норма.
А норма все 150.
Мне поэтическая
щедрость
Приятна, вместе с тем
грустна,
Как результат ума без
сердца,
А может, сердца
без ума».

Невядома, як успрыняў такі адказ Аркадзь Куляшоў і што менавіта ўкладаў у свае радкі Барыс Платонаў, але, думаецца, за юбілейным сталом усё прагучала і было ўспрынята як бяскрыўдны жарт.

Да ста пяцідзесяці Барыс Платонаў не дажыў, памёр у 1967 годзе, пахаваны на Усходніх могілках Мінска. А ў 1968-м у ягоны гонар у Мінску была перайменавана вуліца Высокая.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ЗОРКА З ХАРАКТАРАМ

Як падтрымліваецца памяць пра Святлану Данілюк

Калі вельмі чагосьці хочаш, то абавязкова дасягнеш сваёй мары — гэта даказала оперная дзіва народная артыстка Беларусі і СССР Святлана Данілюк. Яна настолькі хацела стаць спявачкай, што яе залічылі на вучобу ў кансерваторыю, нягледзячы на тое, што дзяўчына тады нават не ведала нот! Але ж які голас мела... Голас стане вызначальным у яе лёсе, які аднойчы і да канца жыцця акажацца звязаны з Беларуссю. Згадаць спявачку прапануюць у сталічным Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, дзе працуе выстаўка «Ракурсы творчасці».

Напрыканцы верасня Святлане Данілюк споўнілася б 85 гадоў, а ў гэтым свеце яе няма ўжо больш за дваццаць. І зорку ўвесь гэты час памятаюць і ўшаноўваюць: яркая была, і святло не згасла дагэтуль. І ёсць людзі, якія слухалі яе на сцэне Вялікага тэатра Беларусі і ў філармоніі, дзе Данілюк працавала салісткай пасля таго, калі прыняла складанае і прынцыповае для сябе рашэнне сысці з тэатра, у які прыйшла з падачы легендарнай Ларысы Александроўскай. А тая, шмат гадоў выконваючы партыю Кармэн у оперы Жоржа Бізэ, прапанавала выйсці ў гэтай ролі ў якасці запрошанай салісткі Святлане Данілюк, якая на той час працавала ў Пермскім акадэмічным тэатры оперы і балета па заканчэнні Кіеўскай кансерваторыі. Тэатр і спявачка неяк адразу супалі па сваіх творчых вібрацыях. Нічога, не адразу, але Святлана адпрацуе размеркаванне і ўсё адно вернецца ў Беларусь, дзе яе так добра прынялі. І таксама будзе яркай выканаўцай партыі Кармэн на беларускай сцэне шмат гадоў. Прынамсі, фота з выстаўкі паказвае артыстку ў гэтым вобразе ў 1976 годзе.

Іншыя фота — іншыя вобразы і разуменне таго, як і што ставіў тэатр тады. Вось Данілюк у ролі Алесі аднайменнай оперы Яўгена Цікоцкага (1967 год), а вось — каварная Амнерыс у «Аідзе» Вердзі

(гэта ўжо 1970 год). І Марфа ў «Хаваншчыне» Мадэста Мусаргскага (1970-ы), Сантуца ў «Вясковым гонары» Масканьі (1973-ы)... А ў 1978 годзе ў Вялікім тэатры Беларусі паставілі оперу айчыннага сучаснага кампазітара Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда» — моцны голас Святланы Данілюк загучаў у партыі зайздросніцы Любкі.

А вось зорка Данілюк у яркай партыі Разіны ў «Севільскім цырульніку» Расіні ў 1979 годзе, і яшчэ ў той жа год яна ўвасобіла Прынцэсу Эбалі ў оперы «Дон Карлас» Вердзі... Фота не паказваюць усе спектаклі і ролі артысткі, але даюць разуменне пра яе запатрабаванасць у беларускім тэатры. Няма больш той дзяўчынкі-кіяўлянкі, якая станавілася на крэсла і спявала, уяўляючы сябе вялікай артысткай. Яна ішла да гэтага статусу паступова і мэтанакіравана (сапраўды як «праз церні да зорак»): кіеўскі кінатэхнікум уяўляўся ёй прыступкай, каб далучыцца да культурнага жыцця. Навучанне ў педагога Зоі Гайдай у кансерваторыі дапамагло раскрыць у сабе самой творчыя магчымасці, якія даваў шырокі дыяпазон голасу. Яго ацанілі на III Усесаюзным конкурсе вакалістаў імя Глінкі ў Маскве, прысудзіўшы Данілюк другую прэмію. Ужо падчас працы ў Мінску яна паехала на стажыроўку ў славуты міланскі тэатр «Ла Скала» — стала адчуваць оперу інакш і працаваць з дадатковым імпэтам. Яна была шчаслівая выступаць для мінскай публікі: яе тут высока ацанілі, прысвоіўшы званне народнай артысткі БССР усяго праз пяць гадоў працы ў нашым Вялікім тэатры, яшчэ праз чатыры яна атрымала званне народнай артысткі СССР. На фота тых гадоў — шчаслівая жанчына і артыстка сярод калег, многія з якіх былі легендамі савецкай сцэны.

І пра Святлану Данілюк можна казаць як пра легенду і прынцыповую творчую асобу, якая не пабаялася страціць сябе і рызыкнула сысці, калі не сышлася ў поглядах на работу з кіраўніцтвам. Сышла з тэатра, а не са сцэны, таму што мела прыхільнікаў і спявала для іх ужо ў канцэртах. Яе канцэртныя сукенкі і строі выстаўлены цяпер для агляду. Цікава пабачыць і тыя адметныя дробязі, што асацыіруюцца з жыццём бамонду: доўгія пацеркі і зіхатлівыя брошкі, вытанчаныя вееры і маленькія рыдыкюлі. А яшчэ важная частка скарбу — калекцыя вінілавых пласцінак: што слухала оперная зорка? У чым знаходзіла натхненне? Як у любых жыццёвых абставінах, знаходзіла магчымасць быць сабой — гэта вялікі і складаны расповед, для якога мала адной выстаўкі. Таму для асабліва зацікаўленых: дакументальны фільм прысвяціў Святлане Данілюк Максім Федасееў, яе сын, які нарадзіўся ў Мінску. І тэатр, дзе яна спявала, шануе памяць спявачкі. Пра якую, як высвятляецца, не забыліся аматары прыгожых спеваў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СПАЧАТКУ — У ШКОЛУ, ПАСЛЯ — У АВАНГАРД,

альбо Чым жывуць нашчадкі творчых наватараў Віцебшчыны?

Сёлета аматары мастацтва адзначаюць адметную дату: 170 гадоў з дня нараджэння Юдэля Пэна, які быў настаўнікам Марка Шагала. Яшчэ адзін знакаміты настаўнік славутых мастакоў працаваў у Мінску — Якаў Кругер, яму сёлета споўнілася б 155 гадоў. Выстаўку у іх гонар цяпер можна паглядзець у Віцебску, куды пераехаў са сталіцы праект, створаны паводле збораў Нацыянальнага мастацкага музея і Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Вядома, знакавыя асобы, дзякуючы якім развівалася прафесійная мастацкая адукацыя на тэрыторыі Беларусі. А Віцебску наогул была адведзена асаблівая роля: быць у авангардзе мастацкіх працэсаў пачатку XX стагоддзя. Ды глядзі далей — і цяпер гэты горад трымае кірунак на творчыя пошукі, праз сучасных мастакоў Віцебшчыны. А між іншым 86 чалавек у рэгіёне з'яўляюцца сябрамі Беларускага саюза мастакоў.

Аб'яднаўчыя працэсы сярод мастакоў у Віцебску пачаліся яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя. Называюць 1920 год, калі Казімір Малевіч стварыў аб'яднанне «Сцвярджальнікі новага мастацтва». Але можна лічыць і з 2019 года, калі Марк Шагал адкрыў на радзіме мастацкае вучылішча — і пачаўся творчы «варушняк». Далей былі спробы мастакоў аб'яднацца — і да вайны, і пасля, ажно да 1970 года, калі афіцыйна ўтварылася Віцебская арганізацыя Беларускага саюза мастакоў.

— Гэта надзвычай цікавы рэгіён у плане творчасці, у плане таго, як мастакі ставяцца да традыцый і якія навацыі сёння прапануюць. Калі прасачыць гісторыю XX стагоддзя, то, напэўна, менавіта Віцебскі рэгіён у 70—80-я гады мінулага стагоддзя быў першы, дзе ўтваралася вельмі шмат новых аб'яднанняў мастакоў, якія спрабавалі развіваць традыцыі Казіміра Малевіча, у першую чаргу менавіта яго і ўвогуле ўсёй віцебскай школы, — гаворыць першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч. — Нават назвы аб'яднанняў вярталі нас да той гісторыі, згадайма знакаміты «Квадрат», створаны Аляксандрам Малеем. Шмат адметных выставачных праектаў зарадзіліся на стыку 80-х і 90-х гадоў XX стагоддзя і працягваюцца сёння, гэта актуальна для Віцебшчыны. Адзін з самых вядомых — праект «Абстракт», які робіць цудоўны віцебскі мастак Васіль Васільеў (летась ён стаў лаўрэатам Нацыянальнай мастацкай прэміі ў галіне жывапісу), ён павяртае да супрэматызму, імкнецца паказаць новыя формы. А ў намінацыі «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» Нацыянальную прэмію атрымлівала Наталля Лісоўская, якая займаецца тэкстылем і ў гэтым відзе ўкараняе сучасныя формы: міні-тэкстыль, вялікі тэкстыль у авангардным выяўленні. Вельмі актыўна працуе Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва. Ён з'явіўся некалькі гадоў таму, і, мне падаецца, сёння адзін з самых цікавых у Беларусі інтэрактыўных музеяў, прысвечаных Віцебскай мастацкай школе. Віцебскія творцы і цяпер самыя актыўныя эксперыментатары сярод 1200 сяброў Беларускага саюза мастакоў. У мінскіх праектах мы з задавальненнем прадстаўляем творы мастакоў віцебскага рэгіёна. Таму што яны асаблівыя, дух наватарства ёсць у многіх з гэтых аўтараў, ён непаўторны і характэрны для мастакоў розных пакаленняў, не толькі моладзі. Хачу згадаць выдатную мастачку Валянціну Ляховіч, чалавека, які шмат гадоў аддаў выкладанню, але пры гэтым яе абстрактныя скульптуры, асамбляжы непаўторныя на прасторы мастацтва Беларусі. Да карыфеяў я б аднесла Аляксандра Салаўёва, які нядаўна пайшоў з жыцця, — выдатны мастак, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, вельмі шмат гадоў працаваў у Віцебскім тэатры, займаўся абстрактным мастацтвам, пакінуў вялізную спадчыну. Маем шмат сведчанняў, што традыцыі пачатку XX стагоддзя, якія зрабілі Віцебск адным з прагрэсіўных цэнтраў мастацтва новага часу, падтрымліваліся на працягу XX стагоддзя і працягваюцца ў XXI.

Цяпер у горадзе дзве навучальныя ўстановы рыхтуюць творчыя кадры: Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт з яго вядомым мастацка-графічным факультэтам і Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, дзе ёсць кафедра дызайну. Яе выпускнікі таксама папаўняюць шэрагі прафесійнай арганізацыі, адзначае Віктар Мікалаеў, старшыня Віцебскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў:

— Наша арганізацыя другая па колькасці пасля Мінска, таму і адказнасць вялікая. Наватарскія кірункі, фармальныя падыходы, у якіх мастакі працуюць, раскрываюцца на выставачных пляцоўках, якія ёсць у горадзе (Віцебскі абласны краязнаўчы музей і мастацкі музей як яго філіял, «Арт-цэнтр Марка Шагала», Цэнтр сучаснага мастацтва і свабодная, незвычайная па планіроўцы пляцоўка «Піраміда»). Ёсць і творчыя аб'яднанні Віцебскага рэгіёна з магчымасцямі ладзіць выстаўкі. Спадчына, якая ў нас была, на сёння развіваецца. Таму што ёсць паняцце «віцебская школа». Калі нашы мастакі выстаўляюцца ў Мінску ці ў іншых абласцях і за межамі краіны, то гэта заўсёды высока ацэньваецца не толькі гледачамі, але і мастацтвазнаўцамі.



Вуліца ў Віцебску вачамі Ю. Пэна.

Сам Віктар Мікалаеў — цікавая асоба, таму што з Мінска, дзе нарадзіўся і вырас, паехаў жыць і працаваць у Віцебск. Як некалі Юдэль Пэн...

— Ніякага авангарда без базы быць не можа, — падкрэслівае Святлана Кот, загадчыца аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стагоддзяў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. — Нездарма ў праекце «Ю. Пэн і Я. Кругер. Мастацкія школы Беларусі» мы гаварылі аб двух педагогах, якія заснавалі свае прыватныя школы на тэрыторыі Мінска і Віцебска. Віцебская школа прадстаўлена з пункту гледжання дзейнасці Юрыя Майсеевіча Пэна, які прыехаў у Віцебск, калі яму было амаль 42 гады і застаўся тут на 40 гадоў. Ён любіў горад і прызнаваўся ў гэтым у лістах да сваіх вучняў. Мы прадстаўлялі творчасць Пэна вельмі яскрава работамі з Віцебскага музея — іх 27. Прывезлі і работы яго вучняў — гэта яшчэ 23 імёны. Большая частка з іх — менавіта прадстаўнікі віцебскага рэгіёна і мастацкай школы Віцебска, а самыя яркія тут Марк Шагал, Восіп Цадкін, Оскар Мешчанінаў, Саламон Юдовін, Леў Зевін і іншыя. Гэта частка нацыянальнай культуры не надта шырока прадстаўлена ў музейных зборах Рэспублікі Беларусь. Але калі мы гаворым пра спадчыну, то яна вельмі яркая, прыгожая і сапраўды наватарская. Тут трэба адзначыць дэмакратычны спосаб выкладання самога Юрыя Пэна, які, магчыма, стаў падмуркам для таго, каб Марк Шагал заснаваў Віцебскае народнае мастацкае вучылішча. А далей па падабенстве парыжскага «Вулля» адбылася гісторыя з запрашэннем Казіміра Малевіча і «УНОВІСам». Смеласць, жаданне — вось той агонь, які даваў Юрый Пэн у Віцебску, да гэтага часу захаваўся.

Кожны год у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адбываецца некалькі праектаў, якія прадстаўляюць творчасць мастакоў Віцебшчыны. Летась запомнілася выстаўка Вячаслава Шамшура, прафесара мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Запланавана выстаўка Леаніда Мядзведскага.

У мастацкім музеі Віцебска ёсць брэндавыя праекты, скіраваныя на тое, каб прадставіць сваіх творцаў. У 2024 годзе гэта мела асаблівае значэнне, калі музейныя пляцоўкі рыхтаваліся да правядзення Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі і трэба было паказаць віцебскіх аўтараў шырока, каб выстаўка была разнастайнай, прадстаўляла розныя традыцыі і кірункі, каб былі работы як з музейных фондаў, так і сучасных аўтараў. З праектамі «Віцебскі мастак» і «Віцебская акварэль» пазнаёміліся ў рэгіёнах Расіі. Праекты прыцягальныя, таму што выяўляюць разнастайнасць мастацкага выказвання, даюць панарамны погляд і нейкі акцэнт. І, як правіла, гучаць імёны 20—30 аўтараў — знакамітых і маладых.

«Важна быць у суполцы, дзе ёсць мэтры, у якіх можна павучыцца, і маладое пакаленне цягнецца, каб больш досведу ўзяць ад вядомых мастакоў. Але калі ствараеш, то ты ўсё роўна адзін, у сваёй майстэрні, — прызнаецца Вікторыя Крупская, сябра Віцебскай арганізацыі Беларускага саюза мастакоў, якая з 2011 года з'яўляецца куратарам і ідэйным натхняльнікам міжнародных жаночых праектаў сумесна з «Арт-цэнтрам Марка Шагала». Такім чынам мастацкая гісторыя нібыта знітавана з ідэямі, што нараджаюцца цяпер.

А калі хто хоча адчуць адметны погляд мастакоў Віцебшчыны ў гэтыя дні, то варта ехаць у Полацк, дзе працуе выстаўка «4-63. Жывапіс».

— «4-63» — гэта аб'яднанне, якое ўтварылася ў 1989 годзе дзякуючы таму, што ў 1981-м адкрылася Полацкая карцінная галерэя, а першыя лічбы яе нумара тэлефона абралі ў якасці назвы мастакі, якія тады жылі ў горадзе. Ужо існавалі «Квадрат», «Няміга-17», «Форма» — тады было модна ствараць аб'яднанні. Наша праіснавала нядоўга, але мы паказвалі сваё мастацтва па Беларусі і за межамі, прапагандуючы Віцебскую школу. Сёння кожны з удзельнікаў працягвае працаваць асобна. Васіль Васільеў стварае не толькі абстрактны жывапіс, але і інсталяцыі, арт-аб'екты, выкладае. Галіна Васільева працуе ў сферы мастацтва супрэматызму, займаецца даследчыцкай дзейнасцю, таксама выкладае. Аляксандр Канавалаў працуе ў галіне калажу. Я працягваю ствараць як мастак-абстракцыяніст, — кажа Алег Ладзісаў, галоўны захавальнік Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, у калекцыі якога больш за 80 работ віцебскіх мастакоў...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Официальные правила

«ЗОЛОТАЯ ОСЕНЬ –

Настоящие правила проведения рекламной игры «Золотая осень – Золотой урожай!» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Lay's», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Золотая осень – Золотой урожай!» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ЗробленаБай», УНП 192009487, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 25 июня 2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192009487 (далее – Организатор). Юридический адрес Организатора: 220070, г. Минск, ул. Буденного, 15А-3.

2. Участники Рекламной игры.

Участниками Рекламной игры могут быть совершеннолетние физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, которые выполнили условия п. 9 настоящих Правил (далее – Участник).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

3. Название Рекламной игры: «Золотая осень – Золотой урожай!»

4. Территория проведения Рекламной игры: магазины розничных торговых сетей «ГИППО» и «Белмаркет», расположенные на территории Республики Беларусь.

5. Дата начала Рекламной игры: 7 октября 2024 г.

6. Дата окончания Рекламной игры: 5 января 2025 г.

7. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра (Игровой продукт):

- ✓ Лейз Из Печи Лисички в Сметане 85г
- ✓ Лейз Из Печи Нежный Сыр Зелень 85г
- ✓ Лейз с Солью 225г
- ✓ Лейз Сметана Лук 225г
- ✓ Лейз Сметана Зелень 225г
- ✓ Лейз Из Печи Сметана и ароматные травы 85г
- ✓ Лейз Стакс Аромат Ребер Барбекю 140г
- ✓ Лейз Стакс Нежная Сметана Лук 140г
- ✓ Лейз Стакс Пикантная Паприка 140г
- ✓ Лейз Краб 140г
- ✓ Лейз Сметана Зелень 140г
- ✓ Лейз Молодой Зеленый Лук 140г
- ✓ Лейз Сметана Лук 140г
- ✓ Лейз Сыр 140г
- ✓ Лейз с Солью 140г
- ✓ Лейз Рифленые Лобстер 140г
- ✓ Лейз Рифленые Лосось Сливочный Соус 140г
- ✓ Лейз Ребрышки Гриль 140г
- ✓ Лейз Паприка 140г
- ✓ Лейз Рифленые Паприка 140г
- ✓ Лейз Краб 225г
- ✓ Лейз Рифленые Паприка 225г
- ✓ Лейз Молодой Зеленый Лук 37г
- ✓ Лейз Краб 37г
- ✓ Лейз Сметана Зелень 37г
- ✓ Лейз Сыр 37г
- ✓ Лейз Краб 70г
- ✓ Лейз Молодой Зеленый Лук 70г
- ✓ Лейз Бекон 70г
- ✓ Лейз Сметана Зелень 70г
- ✓ Лейз Сыр 70г
- ✓ Лейз Рифленые Сметана Лук 70г
- ✓ Лейз Рифленые Паприка 70г
- ✓ Лейз Рифленые Лобстер 70г
- ✓ Лейз с Солью 70г
- ✓ Лейз Паприка 70г
- ✓ Лейз Из Печи Хамон 81г
- ✓ Лейз Духмяныя драники 125г
- ✓ Лейз Рифленые Чили Лайм 125г
- ✓ Лейз из Печи Картофельно-злаковые Вяленый Томат и Базилик 81г
- ✓ Лейз Рифленые Пряная Креветка 90г
- ✓ Лейз Сырное ассорти с мёдом 90г
- ✓ Лейз Малосольные Огурцы и Укроп 140г.

8. Состав и размер призового фонда Рекламной игры

Призовой фонд составляет: **98 679,23 (Девяноста восемь тысяч шестьсот семьдесят девять) белорусских рублей двадцать три копейки.**

Призовой фонд сформирован за счет денежных средств Организатора.

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.

№ п/п	Наименование категории приза	Наименование приза	Определение приза	Кол-во	Стоимость с НДС за ед. бел. руб.	ИТОГО стоимость с НДС бел. руб.	Даты и время розыгрышей
1	Еженедельные призы	Приз 1	Денежный приз в размере 100,00 белорусских рублей	48	100,00	4 800,00	17.10.2024 в 14.00 24.10.2024 в 14.00 31.10.2024 в 14.00
2		Приз 2	Денежный приз в размере 500,00 белорусских рублей	12	500,00	6 000,00	17.10.2024 в 14.00 24.10.2024 в 14.00 31.10.2024 в 14.00
			Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога		43,63	523,56	
3		Приз 3	Денежный приз в размере 1000,00 белорусских рублей	20	1 000,00	20 000,00	17.10.2024 в 14.00 24.10.2024 в 14.00 31.10.2024 в 14.00
			Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога		118,34	2 366,80	
4		Приз 4	Денежный приз в размере 2000,00 белорусских рублей	16	2 000	32 000,00	17.10.2024 в 14.00 24.10.2024 в 14.00 31.10.2024 в 14.00
			Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога		267,77	4 284,32	
5	Главный приз	Главный приз	Денежный приз в размере 25 000,00 белорусских рублей	1	25 000,00	25 000,00	31.10.2024 в 15.00
			Денежное вознаграждение в размере возмещения подоходного налога		3 704,55	3 704,55	

9. Порядок участия в Рекламной игре.

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 07 октября 2024 г. (10:00:00) по 27 октября 2024 г. (23:59:59):

9.1. Приобрести Игровой продукт на сумму не менее 4,00 (четырех) белорусских рублей в одном кассовом чеке, согласно перечню, указанному в п.7, и получить кассовый чек, подтверждающий приобретение Игрового продукта.

9.2. Зарегистрироваться на сайте www.promolays.by, заполнить регистрационную форму, указав следующую информацию:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (при наличии);
- населенный пункт (обязательно);
- дату рождения (обязательно);
- адрес электронной почты (обязательно);
- номер мобильного телефона Участника в международном формате и название оператора (A1, MTC, Life) (обязательно);

9.3. Выразить согласие на участие в проводимой Рекламной игре, подтвердить ознакомление с настоящими Правилами, а также дать согласие на обработку Персональных данных Организатором в рамках проведения Рекламной игры, поставив галочки в соответствующих полях на Интернет-сайте www.promolays.by.

9.4. Загрузить фото или скан кассового чека с наименованием Игрового продукта в личном кабинете, указав дату и номер кассового чека. Изображение кассового чека должно быть чётким и содержать:

- сведения о номере документа;
- дату и время продажи Игровых продуктов;
- наименование Игровых продуктов;
- количество и цену Игровых продуктов;
- итоговую сумму покупки.

Кассовые чеки без наличия информации, указанной в настоящем пункте, либо с наличием Игровых продуктов на сумму меньше 4,00 (четырех) белорусских рублей не могут быть использованы для участия в Рекламной игре.

9.4.1. За каждые 4,00 (четыре) белорусских рубля стоимости Игровых продуктов в одном кассовом чеке (с учетом всех скидок, действующих на момент расчета) присваивается одна Фишка в следующем порядке:

- совершение покупки Игровых продуктов на сумму до 3,99 белорусских рублей – Фишка не присваивается;
